

РЭДКАЯ ПРАФЕСІЯ: ТРАБЛШУТАР СТЫЛЮ **12**

НОВЫ ВОБЛІК ГРОДЗЕНСКАГА ЗАМКА **13**




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

3 ЛІСТАПАДА 2018 г. СУБОТА № 213 (28829)


## ЛІЧБА ДНЯ

**Каля 46,6 %**

*жыхароў Беларусі, або 4421,5 тысячы чалавек, з'яўляюцца прадстаўнікамі дужага полу, паведамляе сайт Нацыянальнага статыстычнага камітэта. На пачатак 2018 года ў Беларусі на 1 тысячу мужчын прыпадала 1147 жанчын. Тры чвэрці мужчын (3417,9 тысячы чалавек) жывуць у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, кожны пяты — у сталіцы. Сярэдні ўзрост беларускіх мужчын складае 37,5 года, прычым тыя, што пражываюць у сельскай мясцовасці, старэйшыя за гараджан. Напрыклад, у Мінску сярэдні ўзрост мужчын не перавышае 36 гадоў. У працаздольным узросце знаходзяцца 64,7 % мужчын (сярод гараджан — 65,8 %, вяскоўцаў — 60,9 %).*

# Каралі гульні



Фота БелТА.

У Брэсце ўчора адкрыўся II Міжнародны шахматны фестываль «Чорная пешка», які сабраў больш за тысячу ўдзельнікаў з 15 краін. Узрост удзельнікаў — ад чатырох гадоў да «70+». Сярод іх і юны шахматыст з Брэста Максім ЦЮГА.

## КОРАТКА

• **Узоры месяцовых парод, сабраных беспілотнай місіяй СССР у 1970 годзе, будуць выстаўлены на таргі аўкцыённага дома Sotheby's.**

• У Беларусі з'явілася магчымасць праверыць анлайн наяўнасць дзейнага дагавора аўтастрахоўкі.



• **Ключы ад кватэр у новым доме ў Старых Дарогах атрымалі 27 шматдзетных сем'яў, а таксама іншыя грамадзяне, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.**

• Народны артыст Беларусі і СССР Ігар Лучанок быў шпіталізаваны ўчора ў мінскую гарадскую бальніцу хуткай дапамогі.

• **У Рэчыцы мужчына хаваў за патайнымі дзвярыма больш за 1,6 тысячы літраў кантрафактнай алкагольнай прадукцыі.**

Мазгавы штурм

# МЫСЛІЦЬ НЕСТАНДАРТНА, КРЫТЫЧНА І КРЭАТЫЎНА,

## або Чаму кожнае меркаванне мае права на існаванне?

**Спецыялісты вылучаюць чатыры кампетэнцыі, найбольш запатрабаваныя ў сучасным свеце: камунікацыя, кааперацыя, крытычнае мысленне і крэатыўнасць. Менавіта навыкам XXI стагоддзя была прысвечана Edcamp Belarus — 2018 — другая педагагічная неканферэнцыя, дзе кожны можа прапанаваць сваю педагагічную ідэю, агучыць праблему, правесці майстар-клас ці проста «прагаласаваць нагамі» за тое, што хоча пачуць. Мерапрыемства падпарадкоўваецца закону «аб дзвюх нагах»: яго ўдзельнікі далучаюцца да той дыскусіі, якая цікавая менавіта ім. Шчыра кажучы, бывае вельмі праблематычна вызначыцца з тым, каго ты хочаш пачуць, асабліва калі абмеркаванне праходзіць адначасова на некалькіх пляцоўках.**

СТАР. 4

Землякі

# УЛАДЫКА І ПЯСНЯР

«Хочаце мудрасці? Чытайце «Новую зямлю», — раіць архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Сцяфан. Яго называюць «місіянерам роднай мовы» і ведаюць як выдатнага знаўцу творчасці Якуба Коласа. Карэспандэнты «Звязды» адправіліся разам з уладыкам на яго малую радзіму, у вёску Карзуны (Чэрвеньскі раён). Гутарка, вядома, пайшла пра спадчыну беларусаў, якую немагчыма ўявіць без веры ў Бога і літаратуры.

## «МНЕ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА...»

Усяго 20 кіламетраў на ўсход ад мітуслівага шумнага Мінска — і трапляеш у іншы свет: вуліцы без асфальту, на драўляным плоце лянiва пазяхае шэры кот, а на лаўках сядзяць бабулі ў хустках.

— Вось яны, мае дарагія Карзуны. Складана паверыць, што раней навокал балоты былі, туманамі прыкрытыя. Добра помню, як жанчыны па журавіны хадзілі... Але правялі меліярацыю. Бачыце, якія роўныя палі цяпер. У добрае надвор'е адсюль нават Нацыянальны аэрапорт відаць, да яго кіламетраў 25, — з ледзь заўважнай ноткай суму кажа ўладыка Сцяфан, акідваючы позіркам невялікую вёску.

СТАР. 5



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# АЎЧЫНКА ВЫРАБУ ВАРТАЯ

## Частку кітайскіх крэдытаў трэба накіроўваць на падтрымку прыватнага бізнесу

**Такую думку выказаў Аляксандр Лукашэнка падчас наведвання Віцебскага футравага камбіната. Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з тэхналагічнымі працэсамі вытворчасці па вырабе аўчыны і пушніны, а таксама з вытворчасцю гатовых вырабаў. Беларускі лідар таксама наведаў цэхі прадпрыемства, яму прадставілі асартымент прадукцыі, якая выпускаецца.**

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Віцебскі футравы камбінат пасля мадэрнізацыі стаў вельмі салідным прадпрыемствам — падарункам народу да свята. Як растлумачыў Прэзідэнт, ён сам, члены ўрада і іншыя вышэйшыя службовыя асобы павінны паказаць людзям, што зроблена за мінулы год, — да 7 лістапада.

Беларускі лідар адзначыў, што ў Беларусі вялікая колькасць нявыбраных камерцыйных кітайскіх крэдытаў, каля сямі мільярдаў, пры гэтым ёсць яшчэ і танныя. Прэзідэнт расказаў, што не так даўно распарадзіўся, каб перасталі арыентавацца толькі на буйныя прадпрыемствы. «Ёсць талковыя прыватнікі, якіх мы ведаем, не проста шарлатаны з вуліцы, вось ім трэба дапамагаць. Яны за 20—30 мільёнаў створаць нам сотні тысяч рабочых месцаў», — сказаў ён.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, не абавязкова выдзяляць на будаўніцтва новых прыватных прадпрыемстваў сотні мільёнаў. Па прыклад далёка хадзіць не трэба: узяць той жа Віцебскі футравы камбінат. У яго рэканструкцыю і мадэрнізацыю інвеставалі каля 24 мільёнаў долараў, а ў будучыні колькасць рабочых месцаў плануецца павялічыць да 500. Мадэрнізацыяй займаўся холдынг «Марка».

Беларускі лідар пахваліў прадпрыемства і адзначыў, што калі б генеральны дырэктар «Марка» Мікалай Мартынаў сябе не зарэкамендаваў, то ён не размаўляў бы ні пра які холдынг.

Дарэчы, Аляксандр Лукашэнка і сам аддае перавагу прадукцыі «Марка». І на камбінат Прэзідэнт прыбыў у чаравіках гэтай фірмы. Ён адзначыў, што на яго абутак звяртаюць увагу і кіраўнікі іншых дзяржаў, напрыклад Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў. Беларускі лідар расказаў аб іх прыватнай гутарцы: казахстанскі кіраўнік пацікавіўся, адкуль у Лукашэнкі такія чаравікі, той назваў беларускага вытворцу, а Назарбаеў не паверыў. У адказ кіраўнік дзяржавы зняў чаравік і прадэманстраваў: назва вытворцы — «Марка». «І не трэба італьянскае, і не трэба французскае», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка закрануў таксама тэму авечкагадоўлі. Ён заявіў, што справаздачу аб развіцці гэтай галіны запатрабуе ўжо вясной ад губернатараў Магілёўскай, Віцебскай і часткова Мінскай абласцей.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ,**
*г. Віцебск.*

**У тэму**

Унітарнае вытворчае прадпрыемства «Віцебскі футравы камбінат» было ўведзена ў строй 30 кастрычніка 1975 года. Яно з'яўляецца адзіным прадпрыемствам нашай краіны, якое спецыялізуецца на перапрацоўцы розных відаў пушна-футравай сыравіны і пашыве вырабаў з яе — адзення, галаўных убораў, аксесуараў.

У адпаведнасці з указам Прэзідэнта аб мерах па развіцці гарбарна-футравай вытворчасці і вытворчасці абутку ў снежні 2013 года сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марка» набыло Віцебскі футравы камбінат у мэтах яго рэканструкцыі, мадэрнізацыі і фінансавага аздараўлення.

З 2014-га ў рамках інвестыцыйнага праекта па стварэнні і мадэрнізацыі вытворчых магутнасцяў па выпуску абутку да 5 мільёнаў пар у год і рэканструкцыі футравага камбіната з улікам стварэння холдынга «Марка» на 2013—2024 гады праводзіцца рэканструкцыя і мадэрнізацыя Віцебскага футравага камбіната пад вытворчасць футра і швейных вырабаў з яго.

У цяперашні час на плошчах прадпрыемства — сучасная вытворчасць, магутнасць па перапрацоўцы — 300 тысяч шкур аўчыны, 250 тысяч шкурак пушной сыравіны ў год і пашыў вырабаў з іх.

За перыяд рэканструкцыі і мадэрнізацыі ўнітарнага прадпрыемства асвоена 43,5 мільёна рублёў інвестыцый у асноўны капітал, пастаўлена 401 адзінка тэхналагічнага абсталявання, створана каля 300 рабочых месцаў.

Садружнасць

# МІРНЫ АТАМ СНД

## Краіны — удзельніцы СНД дамовіліся аб агульнай дапамозе ў выпадку радыяцыйнай аварыі

**Адпаведнае пагадненне падпісана падчас сустрэчы Савета кіраўнікоў урадаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Дакумент значна спросціць працэдуру ўзаемадапамогі і скароціць час рэакцыі на магчымыя інцыдэнты, звязаныя з выкарыстаннем атамнай энергіі ў мірных мэтах.**

Прадстаўнікоў на ўзроўні прэм'ераў, віцэ-прэм'ераў накіравалі ў Астану ўсе краіны — члены СНД, акрамя Украіны.

Развіццё высокатэхналагічнай вытворчасці ў энергетычнай сферы і супрацоўніцтва ў гэтым кірунку стала адной з асноўных тэм пасяджэння. Згаданая галіна найбольш плённая для краін Садружнасці. Стварэнне энергетычнага абсталявання дасць штуршок для мадэрнізацыі вытворчасці, павышэння навуковага патэнцыялу і забяспечыць новымі рабочымі месцамі.

Усяго на парадку дня было 13 пытанняў, сярод якіх узаемадзеянне па прафілактыцы ачагоў хвароб і шкодніка ў лесу на прыгранічных тэрыторыях, сумесная дзейнасць у галіне даследавання космасу, абмен электроннай інфармацыяй для ажыццяўлення падатковага адміністравання.

Асаблівы блок — фінансавыя дакументы. Напрыклад, вызначаны парадак фінансавання мерапрыемстваў па падтрымцы якасці жыцця ветэранаў войнаў. Падпісаны дакументы аб асігнаваннях на стварэнне і развіццё аб'яднанай сістэмы проціпаветранай абароны дзяржаў.

Акрамя таго, удзельнікі пасяджэння зацвердзілі план прыярытэтных мерапрыемстваў у сферы гуманітарнага супрацоўніцтва на 2019—2020 гады, большасць якіх будуць прысвечаны святкаванню 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнт Арменіі распусціў парламент

Прэзідэнт Арменіі Армен Саркісян падпісаў указ аб роспуску Нацыянальнага сходу краіны ў адпаведнасці з заканадаўствам. У гэтым жа дакуменце ён прызначыў пазачарговыя выбары парламента Арменіі на 9 снежня.

Парламент распусцілі пасля таго, як прэм'ер-міністр Нікол Пашынян, які заняў гэтую пасаду пасля акцый пратэсту, заявіў аб сыходзе ў адстаўку і двойчы не быў пераабраны ў ходзе галасаванняў парламента.

### Расіяне назвалі сімвалы, якія аб'ядноўваюць краіну

Гімн дзяржавы з'яўляецца аб'ядначым сімвалам краіны, такое меркаванне выказалі 20 % жыхароў Расіі. Пра гэта сведчаць даныя апытання УЦВГД, праведзенага напярэдадні Дня народнага адзінства, перадае ТАСС.

Другое месца па папулярнасці заняла песня "Дзень Перамогі" (8 % рэспандэнтаў), тройку замыкае «Кацюша» (7 % апытаных). Сярод літаратурных сімвалаў, якія аб'ядноўваюць расіян, рэспандэнты адзначылі раман «Вайна і мір» Льва Талстога (11 %), творы Аляксандра Пушкіна (4 %) і раман "Ціхі Дон" Міхаіла Шолахава (3 %).

Літаратурнага персанажа Ілью Абломава з аднайменнага рамана Івана Ганчарова 4 % апытаных звязваюць з вобразам, які найбольш адпавядае звычайнаму жыхару Расіі. Яшчэ па 2 % рэспандэнтаў адзначылі вобраз Аляксея Марэсьева з «Аповесці пра сапраўднага чалавека», Андрэя Балконскага з «Вайны і міру», Паўла Карчагіна з аповесці «Як гартавалася сталь», казачных персанажаў Івана-дурня і Ілью Мурамца.

Найважнейшай гістарычнай падзеяй 63 % расіян назвалі Дзень Перамогі 9 мая, 12 % — далучэнне Крыма ў сакавіку 2014 года, 8 % апытаных адзначылі рэвалюцыю 1917 года, а 5 % — палёт у космас Юрыя Гагарына.

Аб'ядноўваючымі краіну фільмамі расіяне лічаць камедыю «Іронія лёсу, або З лёгкай парай!» (9 %) і кінакарціну «Масква слязам не верыць» (5 %). Па 4 % апытаных адзначылі «Брыльянтавую руку», «У бой ідуць адны «старыя», «Іван Васілевіч мяняе прафесію», «Каханне і галубы».

Галоўнай святочнай стравай у Расіі лічыцца салат аліўе (51 %), 28 % расіян адзначаюць «селядца пад футрам» і пельмені, яшчэ 17 % — боршч.

### СМІ: Дэвід Кэмеран хоча ўзначаліць МЗС Вялікабрытаніі



Былы прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі (2010—2016) Дэвід Кэмеран спадзяецца вярнуцца ў вялікую палітыку і ўзначаліць брытанскі МЗС. Пра гэта паведаміла ў пятніцу газета The Sun са спасылкай на інфармаваныя крыніцы.

Паводле яе даных, Кэмеран сказаў сябрам, што «разглядае магчымасць вяртання ў вялікую палітыку і бачыць сябе ў якасці міністра замежных спраў», калі яго запросіць будучы лідар кансерватараў.

На рэферэндуме па пытанні далейшага ўдзелу Злучанага Каралеўства ў ЕС 23 чэрвеня 2016 года перамогу з вынікам 51,9 % атрымалі праціўнікі еўраінтэграцыі. Кэмеран жа, які ініцыяваў гэта галасаванне, спадзяваўся на перамогу прыхільнікаў яднання з ЕС. Пасля такога выніку ён пакінуў пасаду прэм'ера, і торы ўзначаліла міністр унутраных спраў Тэрэза Мэй, якая аўтаматычна стала кіраўніком урада.

Глабальны кантэкст

# Ці будуць новыя правілы?

## Тыдні Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА) прайшлі ў нашай краіне

**Фінальны круглы стол сабраў удзельнікаў у Мінску, дзе яны абмеркавалі ход далучэння Беларусі да СГА, вопыт Расіі і Казахстана, а таксама магчымасці і выклікі для развіцця айчыннай сельскай гаспадаркі.**

Пачынаючы з сакавіка гэтага года пачалася пятая фаза праекта, накіраванага на садзейнічанне ўступленню Беларусі ў СГА. **Уладзімір СЕРПІКАЎ, пасол па асобых даручэннях МЗС Беларусі, кіраўнік перагаворнай дэлегацыі нашай краіны па далучэнні да СГА,** адзначыў, што засталося сем партнёраў, з якімі неабходна дамовіцца пра ўступленне ў арганізацыю: ЗША, ЕС, Канада, Бразілія, Аўстралія, Украіна, Швейцарыя. «Мы спадзяёмся, што членства ў СГА будзе садзейнічаць павышэнню суверэнных крэдытных рэйтынгаў Беларусі. Дазволіць месь больш лёгкі, пашыраны доступ да таннейшых пазыковых сродкаў на развіццё эканомікі Беларусі. Паколькі мы ўжо будзем часткай глабальнай шматбаковай гандлёвай сістэмы, прадказальным партнёрам, і адносіны да нас будуць зусім іншыя, імідж будзе іншы. Па-другое, у краіне будзе створаны больш празрысты і прадказальны інвестыцыйны рэжым», — падкрэслівае Уладзімір Серпікаў.

Эксперты адзначаюць, што Беларусь фактычна ўжо жыве па нормах СГА, бо правілы, якія дзейнічаюць у ЕАЭС, падобныя. **Вольга КАЗАКЕВІЧ, начальнік аддзела СГА і ўніфікацыі гандлёвых рэжымаў кіравання знешнегандлёвай палітыкі Дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці МЗС Беларусі,** звяртае ўвагу, што нормы СГА — гэта як правілы дарожнага руху: яны могуць быць недасканалыя, але, калі іх адмяніць, пачнецца хаос. «Новыя тэхналогіі адкрываюць магчымасці для малога і сярэдняга бізнесу, што, мне падаецца, для нашай краіны вельмі актуальна, — каменціруе Вольга Казакевіч. — Сёння ўсё гэта абмяркоўваецца на пляцоўцы СГА, і хутчэй за ўсё будуць выпрацоўвацца нейкія новыя правілы. Беларусь павінна хутчэй стаць членам СГА, каб уключыцца ў гэты працэс, каб нашы інтарэсы былі ўлічаны».

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# МІНСК ЗБІРАЕ ГАРНЯКОЎ

**14—16 лістапада гэтага года ў Мінску пры падтрымцы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь адбудзецца III Еўразійскі горна-геалагічны форум.**

З моманту правядзення першага мерапрыемства ў 2016 годзе форум застаецца адзінай буйной міжнароднай пляцоўкай для абмеркавання пытанняў дзяржаўнага рэгулявання нетракарыстання Еўразіі з удзелам прадстаўнікоў бізнесу, кіраўнікоў профільных міністэрстваў і ведамстваў, міжнародных інстытутаў і інтэграцыйных утварэнняў.

Паводле слоў **намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Андрэя ХМЕЛЯ,** сёлета на пляцоўцы форуму, які будзе праходзіць у будынку Нацыянальнай бібліятэкі, плануецца абмеркаванне перспектыў лічбавізацыі горнай галіны, развіцця адзінай Еўразійскай інфармацыйнай прасторы, супрацоўніцтва інтэграцыйных аб'яднанняў у сферы нетракарыстання, развіццё крэдытна-фінансавай інфраструктуры сыравінных рынкаў Еўразіі і іншых пытанняў.

Удзельнікамі форуму стануць больш за 500 чалавек з 20 краін СНД, Еўропы і Азіі, уключаючы Беларусь, Расію, Казахстан, Узбекістан, Кыргызстан, Германію, Польшчу, Сербію, Фінляндыю, Індыю, Кітай, Інданезію, Іран, В'етнам і іншыя.

Андрэй Хмель таксама адзначыў, што ў рамках правядзення форуму будуць удзельнічаць «Слаўкалій», «Шахтпраект», «Беларуськалій» і многія іншыя вялікія кампаніі, якія ў сваіх краінах з'яўляюцца безумоўнымі лідарамі ў геолагаразведцы, будуць прадстаўнікі буйных замежных горназдабыўных прадпрыемстваў. Беларусь прадставіць канцэсійныя ўчасткі і арганізацыі, якія могуць аказваць паслугі па распрацоўцы радовішчаў, даследаванні, здабычы карысных выкапняў:

— Мы разглядаем гэтую пляцоўку не толькі як форумную, але і камерцыйную, для нас важна ў тым ліку і заключэнне дагавораў, — падкрэсліў Андрэй Хмель.

**Вольга ПРАЛЮК.**

На варце якасці

# ДЫЯГНОСТЫКА БЕЗ ПАМЫЛАК

## Медыцынскія лабараторыі будуць праходзіць акрэдытацыю

**З пачатку года ў краіне зацверджылі каля 650 дзяржаўных стандартаў. Новыя распрацоўкі датычацца розных галін эканомікі і сацыяльнай сферы.**

— Яны накіраваны на выкананне патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў ЕАЭС, падтрымку інавацый, абарону навакольнага асяроддзя. Каля 70 працэнтаў з іх гарманізаваны з міжнароднымі і еўрапейскімі патрабаваннямі, — адзначыў **першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Валянцін ТАТАРЫЦКІ.**

Асаблівую ўвагу ўдзяляюць якасці паслуг, бо менавіта гэта сфера дае палову ВУП краіны. На сённяшні ёсць 147 стандартаў па аказанні паслуг — ад рамонту бытавой тэхнікі да пральняў і пахавальных бюро. Цяпер паступаюць звароты ад спажыўцоў з просьбай распрацаваць стандарт па дзейнасці клінінгавых кампаній, бо многія сутыкнуліся з няякасным абслугоўваннем у гэтай сферы.

Распрацаваны праект закона «Аб забеспячэнні адзінства вымярэнняў». У 20-х чыслах лістапада ён будзе прадстаўлены ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу для разгляду ў першым чытанні. Мяркуецца, што дакумент дазволіць прамысловаму сектару ўкараняць сучасныя тэхналогіі, у тым ліку Індустрыі 4.0.

Цяпер разглядаецца пытанне акрэдытацыі медыцынскіх лабараторый. **Дырэктар Беларускага дзяржаўнага цэнтра акрэдытацыі Таццяна НІКАЛАЕВА** паведаміла, што ў нас амаль паўтары тысячы ўстаноў аховы здароўя і камерцыйных медыцынскіх арганізацый, якія праводзяць аналізы і дыягностыку. Яны дзейнічаюць па ліцэнзіі, але падчас яе выдачы не ацэньваецца тэхнічная кампетэнтнасць і дакладнасць вынікаў даследаванняў. З-за гэтага могуць быць рызыкі памылковых вынікаў, аналізы даводзіцца дубляваць у розных арганізацыях. Таму правядзенне акрэдытацыі (як гэта робяць у Еўропе) лічаць мэтазгодным.



Нядаўна былі падпісаны глабальныя пагадненні з Міжнароднай арганізацыяй па акрэдытацыі лабараторый і Міжнародным форумам па акрэдытацыі. «Гэта вялікі крок да зняцця тэхнічных бар'ераў у гандлі. Істотна могуць скарачацца выдаткі на працэдуры ацэнкі адпаведнасці пры экспарце прадукцыі, што паспрые павышэнню канкурэнтаздольнасці», — растлумачыла Таццяна Нікалаева. І прывяла некалькі прыкладаў. Выпрабаванне адзінкі машыннай прадукцыі ў Еўрапейскім саюзе, напрыклад у Польшчы, каштуе нашым прадпрыемствам каля 25 тысяч еўра, у той час як такія іспыты ў нашай краіне абыдуцца ў 2,5 тысячы еўра. Калі казаць пра сельскагаспадарчую тэхніку, то цана выпрабавання адной адзінкі за мяжой складае 16 тысяч еўра, а ў Беларусі — 5 тысяч.

У краіне плануюць таксама стварыць рэферэнтныя лабараторыі для вырашэння гандлёвых спрэчак, калі адзін з бакоў нязгодны з вынікамі выпрабавання.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### КОШТ ПЕРАЛЁТАЎ — ДА МІНУС 75 % АД ЦАНЫ

**«Белавія» ўводзіць эксперыментальныя тарыфы па большасці напрамкаў рэгулярнай сеткі маршрутаў авіякампаніі да канца зімовага раскладу.**

Кошт авіябілетаў па новых тарыфах на некаторых напрамках зніжаны да 75 працэнтаў. Эксперыментальныя тарыфы буду даступныя па наступных напрамках: Сочы, Амстэрдам, Алматы, Барселона, Брусель, Берлін, Будапешт, Ерэван, Батумі, Жэнева, Гановер, Харкаў, Калінінград, Казань, Санкт-Пецярбург, Ларнака, Лондан, Львоў, Мілан, Адэса, Парыж, Прага, Рым, Растоў, Стакгольм, Тбілісі, Тэль-Авіў, Бялград, Ніжні Ноўгарад, Краснадар, Кішынёў і Астана.

Напрыклад, па найбольш папулярных напрамках кошт перавозкі будзе наступны: на Барселону ў адзін бок з вылетам з Мінска — 35 еўра, туды-назад — 86 еўра. На Мілан, адпаведна, 35 і 88 еўра, на Парыж — 35 і 117 еўра, на Лондан — 35 і 95 еўра, на Брусель — 45 і 79 еўра.

Умовамі прымянення новых тарыфаў прадугледжаны продаж толькі праз уласны сайт авіякампаніі www.belavia.by не менш, чым за 45 дзён да вылету рэйса, а максімальны тэрмін знаходжання ў пункце прызначэння па згаданым тарыфе складае адзін месяц. Дазваляецца камбінацыя з іншымі даступнымі тарыфамі эканамічнага класа на выбраных напрамках, а вось змяненні і зварот забароненыя, у тым ліку пры камбінаванні тарыфаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ЗДАЦЬ ПУСТУЮ БУТЭЛЬКУ ЗА 20 КАПЕЕК

**Падрыхтаваны праект указа аб стварэнні ў краіне дэпазітна-закладной сістэмы збору тары.**

Як паведамляюць у Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі, зараз дакумент праходзіць працэдуру ўзгаднення з зацікаўленымі ведамствамі. Ідэя новай сістэмы заключаецца ў наданні эканамічных стымулаў насельніцтву вярнуць выкарыстаную тару для яе далейшай перапрацоўкі. Гаворка ідзе пра збор не толькі шкляных, але і ПЭТ-бутэлек, металічных бляшанак з-пад напояў. Выпіўшы напой, пакупнік можа выкінуць пустую тару ў кантэйнер і страціць суму закладу або здаць у тарамат, устаноўлены ў краме, і вярнуць яе. Такім чынам, сума закладу не павялічвае выдаткі спажыўца. Сума закладу можа скласці, арыенціровачна, 20 капеек.

У Мінжылкамгасе ўдакладнілі, што ўжо выканана тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне, якое пацвердзіла магчымасць рэалізацыі ў краіне такога праекта. Новую сістэму плануецца ўкараняць з прыцягненнем інвестара, які будзе вызначаны па конкурсе. Плануецца, што новы механізм запрацуе ўжо да 2020 года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ПАЛЯВАННЕ — АДКРЫВАЕЦЦА, ЛОЎЛЯ — ЗАБАРАНЯЕЦЦА

**Гэты сезон палявання на пушнога звера распачынаецца з 3 лістапада і будзе доўжыцца да 27 студзеня наступнага года.**

Паляўнічым дазволена здабываць зайца-беляка, зайца-русака, вавёрку, лясную і каменную куніцу, амерыканскую норку, андатру і лясного тхара, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. У дні адкрыцця палявання супрацоўнікі Дзяржінспекцыі будуць працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. Незаконнае паляванне цягне адміністрацыйную, крымінальную і грамадзянска-прававую адказнасць.

З мэтай стварэння спрыяльных умоў для ўзнаўлення чудского сіга з 1 лістапада да 15 снежня ў Беларусі ўстаноўлена забарона на яго вылаў. У гэты перыяд у сіга праходзіць нераст. А вось сом, наадварот, вельмі адчувальны да пахаладання, таму раней залягае на зімоўку. Для захавання папуляцыі ў зімовы перыяд з 1 лістапада да 31 сакавіка яго вылаў паўсюдна забаронены. Здабыча гэтых відаў рыбы ў час забароны абыдзецца парушальнікам у буйныя сумы: 12 базавых велічынь за кожную асобіну еўрапейскага сома і 9 базавых — за кожную асобіну чудскага сіга.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ПАСЛЯДОЎНІКІ ПЛАТОНА СУСТРАКАЮЦЦА НА ТАТАМІ

**З 1 па 4 лістапада ў Бабруйску праходзіць чэмпіянат свету па панкратыёну, у якім прымаюць удзел 300 прадстаўнікоў больш чым з дваццаці краін свету. Гэта самыя маштабныя гульні за апошні час іх існавання.**

Найбольш шматлікія каманды прыехалі ў Бабруйск з Беларусі, Расіі, Украіны і Казахстана. Упершыню ўдзел у спаборніцтвах прымаюць Аўстралія і Катар. Бai праходзяць у сценах сямітысячнай «Бабруйск-Арэны» адначасова на трох дыванах. Сіламі мераюцца мужчыны і жанчыны ў розных узроставых і вагавых катэгорыях. За чатыры дні чэмпіянату будзе разыграна 70 камплектаў медалёў. Гледачы змогуць ацаніць магчымасці як пачаткоўцаў, так і заслужаных майстроў гэтага віду спорту. Сярод апошніх кумір бабруйскіх заўзятараў, іх зямляк Арцём Дамкоўскі.

Чэмпіянат праводзіцца па ініцыятыве Міжнароднай арганізацыі «Аб'яднаны свет барацьбы» (UWW), Беларускай федэрацыі панкратыёна і змешаных баявых адзінаборстваў пры падтрымцы Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, Магілёўскага аблвыканкама і Бабруйскага гарвыканкама.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### ПАДАТКІ «ПАЦЯГНУЛІ» НА ПЯЦІГАДОВЫ ТЭРМІН

**Індывідуальны прадпрымальнік з Ліды, аднойчы судзімы, зноў асуджаны на пяць гадоў за махлярства ў асабліва буйным памеры.**

Ланцужок супрацьпраўных дзеянняў, як аказалася, доўжыцца ажно з 2010 года. У гэты час лідчанін з'яўлецца адначасова ўласнікам адной фірмы, дырэктарам і індывідуальным прадпрымальнікам. Шляхам падману службовых асоб суб'ектаў гаспадарання і індывідуальных прадпрымальнікаў лідчанін К. завалодаў грашамі і таварна-матэрыяльнымі каштоўнасцямі на суму 211 тысяч рублёў. Гэты факт устаноўлены Лідскім міжраённым аддзелам УДФР КДК Гродзенскай вобласці, таксама выяўлены іншыя махінацыі мужчыны з ілжэпрадпрымальніцкімі структурамі.

Суд кваліфікаваў яго дзеянні адразу па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэкса Беларусі і прызначыў мужчыну пяць гадоў пазбаўлення волі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ПЕРШАЕ ДЗІЦЯЧАЕ

**У Беларусі запускаюць забаўляльна-пазнавальны тэлеканал, які робяць дзеці для дзяцей**

**«Пералічыце, колькі вы ведаеце дзіцячых праграм на беларускім тэлебачанні, — прапануе кіраўнік адукацыйна-прадзюсарскага цэнтра «Гумарынка» і аднайменнай кінастудыі, заслужаны артыст Беларусі Яўген Крыжаноўскі. — Іду ў заклад, што хопіць пальцаў адной рукі. Мы, дарослыя, часта забываемся, што будучыня — за нашымі дзецьмі, і абыякава назіраем, як з тэлебачання «вымываецца» дзіцячы кантэнт, а дзеці, у сваю чаргу, не глядзяць наша тэлебачанне, не чытаюць нашы газеты, а масава сыходзяць у інтэрнэт. Трэба з гэтым штосьці тэрмінова рабіць!»**



У выпадку Крыжаноўскага «штосьці» — гэта знятыя за 4 гады існавання студыі больш як 200 выпускаў дзіцячага тэлечасопіса «Гумарынка» і звыш 60 серый перадачы «Адказвайка», а таксама праграмы «Стыльняшкі» і «Утрамдзія», якія апошнія некалькі гадоў выходзілі ў эфіры трох розных айчынных каналаў. Але ў тым і рэч, тлумачыць артыст, што праграмы выходзяць то там, то тут, з рознай перыядычнасцю, і шукаць іх адмыслова ніякі глядач не будзе. Між тым запатрабаванасць з боку гледачоў ёсць: «Мы рэгулярна сустракаемся са школьнікамі, расказваем пра сябе, пытаемся, што ім было б цікава паглядзець. Нядаўна на сустрэчы ў Маладзечне, калі запыталіся, хто наогул глядзеў «Гумарынку», практычна 400 дзяцей, уся зала падняла рукі!» Таму, грукаючы ў розныя дзверы, кіраўнік кінастудыі аднойчы дайшоў да сямейнага тэлеканала пра здаровы лад жыцця +TV, які ўваходзіць у групу кампаній «Белвіясат», — і знайшоў паразуменне. Вынікам яго стаў запуск першага дзіцячага тэлеканала, прэм'ера якога адбудзецца 4 лістапада ў ранішнім эфіры +TV. Пагладзець падборку з разнастайных рубрык, дзіцячага гумарыстычнага серыяла «Школа № 13», музычнага роліка, мультыплікацыі і мастацкага фільма па эфірным і кабельным тэлебачанні змогуць гледачы ва ўсіх гарадах Беларусі. «Наша патэнцыйная аўдыторыя — каля трох мільёнаў гледачоў», — адзначае галоўны рэдактар канала +TV Ганна Казлоўская.

...У кадры канала «Гумарынка-ТБ» — амаль выключна дзеці, ад дашкольнікаў да старшакласнікаў, і расказваюць яны пра тое, што цікавіць іх саміх: абмяркоўваюць герояў мультфільмаў і хатніх улюбёнцаў, разважаюць, што б такога моднага і зручнага апрануць і што паслухаць, задаюць мудрагелістыя пытанні і шукаюць на іх адказы.

У наступны месяц дзіцячы канал будзе выходзіць толькі па 2 гадзіны ў суботу і нядзелю, але ўжо ў снежні партнёры плануюць запусціць штодзённыя выпускі і аздобіць іх найлепшымі дзіцячымі стужкамі «Беларусьфільма», а таксама папулярнымі замежнымі мультфільмамі ў беларускамоўным агучванні. Акрамя таго, заўважае прадзюсар «Гумарынкі» і вядучая праграмы «Пераробкіна» Вольга Прылюбка, канал будзе цікавы тым дзецям і падлеткам, якія ўжо вызначыліся з будучай прафесіяй, — мараць стаць, напрыклад, акцёрамі, рэжысёрамі, аператарамі, журналістамі, тэлевядучымі і шукаюць, дзе маглі б праявіць свае здольнасці.

Праект дзіцячага тэлебачання, дарэчы, атрымаў падтрымку і ў Міністэрстве інфармацыі: у хуткім часе спецыялісты абмяркуюць за круглым сталом пытанне дзіцячага кантэнту ў айчыннай медыясферы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Да народных пісьменнікаў — праз QR-код

**Аўдыторыя «Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі» адкрылася на філалагічным факультэце БДУ. У ёй размешчана 17 персанальных стэндаў класікаў беларускай літаратуры. Менавіта столькі культурных дзеячаў за ўсю гісторыю беларускай літаратуры былі ўдастоены званняў «Народны паэт Беларусі» і «Народны пісьменнік Беларусі».**

Кабінет стане не проста мемарыяльным комплексам памяці, але і інавацыйнай пляцоўкай для педагагічнай дзейнасці. На стэндах размешчаны QR-код, які дазваляе студэнту пераходзіць на сайт пра народнага пісьменніка. Электронны рэсурс складаецца з 17 тэматычных раздзелаў. Іх напаўненне ажыццяўляюць вучоныя і выкладчыкі філалагічнага факультэта. Важным складнікам з'яўляецца ўказанне прафесійнай сувязі пісьменнікаў з БДУ. З 17 народных пісьменнікаў восем з'яўляліся ў розны час выпускнікамі ўніверсітэта, працавалі ў вядучай ВНУ або былі ўдастоены звання «Ганаровы прафесар БДУ». Мяркуецца, што вынікі вучэбнай і навуковай дзейнасці студэнтаў у будучыні папоўняць тэматычныя раздзелы сайта.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# МЫСЛІЦЬ НЕСТАНДАРТНА, КРЫТЫЧНА І КРЭАТЫЎНА

## Складаны выбар Паўлінкі

Міжнародныя даследаванні самых розных узроўняў, у тым ліку PIRLS і PISA, сведчаць пра тое, што сучасныя дзеці чытаюць не толькі менш, але і значна горш, чым іх равеснікі 20—30 гадоў назад. Але праблема заключаецца не ў хуткасці чытання, хоць і ў гэтым плане ўжо гучаць трывожныя сігналы. Галоўная праблема — у асэнсаванні і разуменні прачытанага, уменні ўсвядоміць і пачуць тое, што хацеў сказаць аўтар. Цікавы вопыт заходніх краін, дзе творы класікаў «перакладаюць» на сучасную мову. Гэтым займаюцца таленавітыя майстры слова, якія робяць класічную літаратуру даступнай для новага пакалення чытачоў, адаптуюць яе пад нашы рэаліі, прапануюць сучаснае наватарскае асэнсаванне твора. Мала шанцаў, што падлеткі асіляць вялікі твор. Безумоўна, нават самы таленавіты пераказ рамана Купера «Апошні з магікан» не заменіць чытанне арыгінала, затое ёсць шанц, што творчасць цікавага пісьменніка не застанецца ўвогуле незаўважанай падлеткамі, а кагосьці, можа, падштурхне і да пошуку першакрыніцы.

«Інтэрпрэтацыя мастацкага тэксту як умова развіцця крэатыўнасці» — менавіта так гучала на Edcamp Belarus — тэма майстар-класа **настаўніцы беларускай мовы і літаратуры віцебскай гімназіі № 5 Галіны СУХАВАЙ.**

— Пад крэатыўнасцю я разумею здольнасць асобы да творчасці, нестандартнага мыслення, генерыравання вялікай колькасці арыгінальных і карысных ідэй. Я ўпэўнена, што ўрок літаратуры не можа быць падобны на ўрок матэматыкі. Калі ты не ведаеш, як рашаць матэматычную задачу, то можаш падгледзець правільны адказ у канцы падручніка і падагнаць пад яго сваё рашэнне. А ў літаратуры правільных адказаў няма, — разважае педагог. — Мастацкі твор можна чытаць зноў і зноў і кожны раз адкрываць для сябе новы сэнс. Мы літаральна на кожным кроку сутыкаемся з неабходнасцю інтэрпрэтацыі нейкай інфармацыі, перакладу яе на зразумелую нам мову. А што датычыцца мастацкіх твораў, то іх даводзіцца «перакладаць» на мову, зразумелую вучню, асабліва калі размова ідзе пра лірыку. Усе настаўнікі ведаюць, як складана ідзе знаёмства з вершам Янкі Купалы «Спадчына». Гэта восьмы клас. Праграма па гісторыі адстае ад праграмы па літаратуры. Я пачынаю ўрок з вывучэння юрыдычнай тэрміналогіі. Хто такія спадчыннікі? Што можна атрымаць у спадчыну? Ці можа мець слова «спадчына» пераноснае значэнне? Ці можна яго пісаць з вялікай літары? Так мы паступова выходзім на грамадзянскую ідэю.

Тады я пытаюся: «Каб захаваць дзяржаўнасць, што трэба перадаць у спадчыну будучым пакаленням?» і прашу назваць тры пазіцыі. Абавязкова трэба даць дзецям падумаць — гэта вельмі важна, бо раней я задавала пытанне, ганарылася тым, якое яно класнае, і практычна адразу сама давала на яго адказ. Вучні адказваюць: мова, гісторыя, традыцыі (іх мы аб'ядноўваем пад

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Ларыса ВАЛЫНЕЦ: «У дзяцей проста выдатна атрымліваецца прыдумляць гісторыі: страшныя, вясёлыя, трагічныя ці шчаслівыя...»

агульным паняццем «культура»), тэрыторыя і народ. Ідэі прасцей генерыраваць у групе, бо там не так страшна памыліцца: адказнасць размяркоўваецца на ўсіх. Далей спрабуем прачытаць тое, што ў творы было завуалявана аўтарам. Вы не знойдзеце гэта ў падручніках па крытыцы. *«І тое нуднае ягнят бляянне-зоў на пасьбішчы. І крык вароніных грамад на могілкавым кладбішчы»*. Вобраз ягніцы — нявінныя ахвяры імперыялістычнай вайны. «Крык на могілкавым кладбішчы» — забітыя беларусы і гэтак далей. І ўпершыню дзеці вучаць гэты верш на памяць ужо ўсвядомлена, хоць лексіка для васьмікласнікаў вельмі складаная...

Сёння настаўнік літаратуры не можа звярнуцца да культурнай памяці вучня. Іншасказанні, метафары, эпітэты не заўсёды можа зразумець сучасны падлетак. Звыклыя пытанні традыцыйнай методыкі «Якія пачуцці выклікаў твор?», «Пра што верш?» — не працуюць. Той жа Янка Купала, п'еса «Паўлінка». Самы папулярны вучнёўскі адказ на пытанне «Каго ці што хацеў паказаць аўтар у вобразе Паўлінкі?» наступны: «Дзяўчыну, якая ніяк не можа вызначыцца з выбарам». Ці не занадта дробна для класіка? А можа быць, Паўлінка — гэта маладая Беларусь, якая стаіць перад выбарам? Як вам такое трактаванне твора? Мне вельмі падабаецца, калі ўрокі літаратуры ператвараюцца ў маральна-этычныя гутаркі. Верш Максіма Танка «Шчасце»: «Прастае шчасце людское...» Разважаем, а што такое шчасце для кожнага з нас? Літаратура дае магчымасць аргументаваць сваю пазіцыю, і пасля вывучэння твора дзеці могуць яе або памяняць, або знайсці падтрымку ў асобе аўтарытэтнага пісьменніка. Вывучаем апавяданне Янкі Брыля «Галя». Шукаем адказ на пытанне, чаму мужчына бярэ на сябе смеласць весці аповед ад імя жанчыны?

Галіна Сухава ўпэўнена, што літаратурная і моўная адукацыя на сучасным этапе развіцця грамадства лепш за матэматычную фарміруе гнуткасць мыслення, уменне суперажываць, перавучвацца і апрацоўваць новую інфармацыю.

— Мы разам з вучнямі стараемся разгадаць таемны сэнс паслання пісьменніка чытачу. Часам вельмі цяжка прадбачыць, як дзеці «прачытаюць» той ці іншы вобраз твора, але ад гэтага ўрок становіцца цікавы і складаны адначасова, ён страчвае першапачатковую зададзенасць, прадвызначанасць, пакідае месца для манеўру думкі, прачытання вобраза, — падкрэслівае настаўніца. — Калі на літаратуры мы будзем вучыць адназначнаму ўспрыманню твора, то не трэба дзівіцца таму, што ў пошуках інфармацыі нашы дзеці пойдуць па «першай спасылцы». Вельмі карыснымі становяцца ў гэтым сэнсе літаратурныя парталы, якія даюць магчымасць вучням пераканацца, што нават успрыманне класічнай літаратуры ў сучасным свеце неадназначнае. Не трэба баяцца шматзначнасці меркаванняў, а вось уменню адшукаць сярод іх праўдзівыя і памылковыя трэба вучыцца. Без развіцця крытычнага мыслення не абысціся...

## «Казачная» медыяадукацыя

**Настаўнікі з гродзенскай сярэдняй школы № 26 Таццяна і Сяргей ФАДЗІНЫ** некалькі гадоў таму захапіліся медыяадукацыяй. Таццяна выкладае англійскую мову, Сяргей — фізіку. На Edcamp Belarus яны паспрабавалі захапіць аналізам медыятэкстаў і сваіх калег. І ў іх гэта выдатна атрымалася. «Па вушах цякло, а ў мозг не трапіла» — менавіта так гучала тэма іх «сямейнага» майстар-класа. Крытычнае мысленне, уменне распазнаць перадузятасць, дэзынфармацыю і хлусню, заўважыць, што месцамі гісторыя наўмысна пазбаўлена важных падрабязнасцяў, — вельмі карысныя навыкі для сучаснага чалавека. Дарэчы, падчас міжнароднага даследавання PISA-2018, у якім упершыню прыняла ўдзел і наша краіна, правяралася як чытацкая, так і медыяадукаванасць. Усе цяпер з нецярплівасцю чакаюць яго вынікаў...

А пакуль «інфармацыя для роздуму»... «Гэты казачны герой з'явіўся ў цяжкія і крызісныя, асабліва для немаладых людзей, часы. Кінуўшы родных, ён пачаў вандраваць, ладзячы свае выступленні. Аднак чацвёртае скончылася трагічна — смерцю героя. Пра каго ідзе размова?» Прызнайцеся, ці адразу вы пазналі Калабка? «Казкі — цудоўная глеба для развіцця медыякампетэнцый», — упэўнены Таццяна і Сяргей. Якія эмоцыі выклікае ў вас Калабок? Гэта станоўчы ці адмоўны герой?

«Уявіце сабе, што вам трэба тры дні і тры ночы ехаць у карэце на баль да караля. Выберыце са спіса трох чалавек, якіх бы вы ўзялі з сабой у карэту, а каму б катэгарычна адмовілі, — прапануе Таццяна і агучвае спіс «кандыдатаў»: цыганка, скінхэд, малады чалавек, хворы на СНІД, неакуратна апранутая жанчына з малым дзіцем, каўказец-мусульманін, селянін з вялікім мехам, афрыканскі студэнт, падлетак, падобны на наркамана, былы зняволены, таджык у нацыянальным адзенні, міліцыянер, інвалід са складным вазком, кітаец, які спажывае пахучую ежу, чалавек, які размаўляе на незразумелай мове. Гэта практыкаванне — цудоўная дэманстрацыя таго, як нам навязваюцца сацыяльныя стэрэатыпы. Ці змаглі б вы знайсці для сябе трох спадарожнікаў? А можа, хто-небудзь з іх не захацеў бы ехаць з вамі? Ці дапускаеце вы такую думку?

— У школе трэба абавязкова працаваць са стэрэатыпамі. Сацыяльныя стэрэатыпы фарміруюцца вельмі рана, яшчэ да таго, як дзіця ўсвядоміць, да якой групы яно належыць, — папярэджвае Сяргей Фадзін. — Людзі з лёгкасцю гатовы даваць сацыяльным групам грубыя і прадузятыя ацэнкі. Прычым гэтыя характарыстыкі вылучаюцца стабільнасцю цягам доўгага часу. Яны могуць змяняцца ў залежнасці ад сацыяльных і палітычных працэсаў у грамадстве, але адбываецца гэта вельмі марудна. А вось сацыяльныя сеткі вельмі спрыяюць іх распаўсюджванню, як і распаўсюджванню мовы варожасці...

## А раскажу я вам гісторыю...

«Настаўнік у школе вёў урокі кожны дзень. Ён быў упэўнены, што робіць усё правільна, але дзецям чамусьці было сумна. Іх цікавілі выключна гаджэты, а ўрок яны лічылі пустым марнаваннем часу. І педагог засумняваўся, а ці можна вучыць дзяцей так, як гэта рабілі сто гадоў таму? Калегі па школе яго заспакоілі, маўляў, не хвалюйся, усё ў нас у парадку. З інтэрнэту ён даведаўся пра Edcamp Belarus. Далей... Мінск, сустрэча з аднадумцамі, выступленні экспертаў з розных краін, і ён, нарэшце, зразумеў, як трэба вучыць дзяцей у інфармацыйным грамадстве». Гэту гісторыю прыдумалі самі педагогі на майстар-класе **настаўніцы гісторыі з сярэдняй школы № 5 горада Смаргоні Ларысы ВАЛЫНЕЦ.** Тэма — сторытэлінг (storytelling) на школьных уроках.

— Размова ідзе пра спосаб данясення да аўдыторыі інфармацыі праз апавяданне гісторый з рэальным ці выдуманым персанажам. Мы ўсе любім расказваць і слухаць гісторыі і любім, калі пра складанае расказваюць проста. Але як гэта зрабіць? З дапамогай канкрэтнага прыкладу, займальнай гісторыі, — тлумачыць педагог. — Наймальнікі скардзяцца на дэфіцыт эмацыянальнага інтэлекту ў моладзі. А сторытэлінг якраз дапамагае яго развіваць. Сторытэлінг — гэта стварэнне эмацыянальных сувязяў, з дапамогай якіх можна кіраваць увагай і пачуццямі вучняў, расстаўляць патрэбныя акцэнты, засяроджваць увагу на важных рэчах. Выдатны спосаб зрабіць навучанне больш цікавым і інтэрактыўным, дабіцца зваротнай сувязі з вучнямі. Гісторыі павінны перасякацца з жыццёвым вопытам. Любая з іх павінна мець завязку, кульмінацыю, развязку і лагічнае завяршэнне, якое падштурхне дзяцей да высновы. Расказаныя гісторыі матывуюць і падахвочваюць да дзеяння.

Чаму інфармацыя, пададзеная ў выглядзе гісторыі, найлепш успрымаецца? За сваё жыццё чалавек асвойвае вялізную яе колькасць: нейкую ён адкідае, а нейкую прымае. Але ёсць такі від інфармацыі, які ён абавязаны прыняць, каб выжыць, — яго называюць асабістым вопытам. І калі герой для вашай гісторыі падабраны правільна, то чалавек, які яе слухае, ставіць сябе на яго месца і пераймае чужы вопыт як свой асабісты. Такім чынам інфармацыя, пададзеная праз сторытэлінг, не сустракае непрымання і засвойваецца лепш.

У класічным сторытэлінгу рэальную сітуацыю з жыцця (ці выдуманую гісторыю) расказвае сам педагог. Дзеці толькі слухаюць і ўспрымаюць інфармацыю. У актыўным — педагог агучвае толькі аснову падзеі, фармулюе праблемы, мэты і задачы. А вучні імкліва ўключаюцца ў працэс складання і пераказвання гісторыі. Ёсць яшчэ і лічбавы сторытэлінг — фармат, калі апавяданне гісторыі дапаўняецца візуальнымі кампанентамі (відэа, скрайбінгам, інфаграфікай, буктрэйлерамі, коміксамі і гэтак далей).



«Па вушах цякло, а ў мозг не трапіла» — менавіта так гучала тэма «сямейнага» майстар-класа Таццяны і Сяргея ФАДЗІНЫХ.

«Галоўная праблема для настаўніка — прыдумаць добрую гісторыю, якая захопіць вучняў. Гэта не проста. І такая падрыхтоўка адбірае шмат часу, — канстатуе Ларыса Валынец. — Таму я асабіста аддаю перавагу актыўнаму сторытэлінгу: у дзяцей проста выдатна атрымліваецца прыдумляць гісторыі (страшныя, вясёлыя, трагічныя ці шчаслівыя), яны з гэтым спраўляюцца лепш за мяне. Можна змяшаць падзеі і даты. А дзеці будуць шукаць адказ на пытанне, магло такое быць ці не?»

Несумненна, што ўрокі гісторыі — выдатная глеба для прымянення сторытэлінгу. Але, як запэўнівае настаўніца, гэта тэхналогія цудоўна падыходзіць і для ўрокаў матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі, геаграфіі і іншых. Вы толькі згадалі плашч-невідзімку, а аўдыторыя ўжо ўяўляе сябе на месцы героя і ўважліва слухае пра складаныя законы фізікі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Фота атрыманы ад арганізатараў EdCamp Belarus — 2018.

# УЛАДЫКА І ПЯСНЯР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы стаім у самым цэнтры Карзуноў — на месцы, дзе калісь знаходзілася пачатковая школа, у якую хадзіў наш герой. Цяпер тут зіхацяць крыжы невялікай капліцы ў гонар Аўгустоўскай іконы Божай Маці. Зазірнуўшы ўнутр, разумееш, што гэта не зусім капліцка, а своеасаблівая «царква-помнік»: ёсць алтар з іканастасам, на сценах — гранітныя дошкі з імёнамі вяскоўцаў, загінулых на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

— Палова з гэтых людзей — мае сваякі, я буў абавязаны ўвекавечыць іх памяць. Дарэчы, загінулі нашыя мужыкі і хлопцы ў баях пад польскім горадам Аўгуставам. Менавіта там, дзе ў Першую сусветную Божая Маці з'явілася перад салдатамі рускай арміі. Таму і капліцу ў гонар Аўгустоўскай іконы асвяцілі.

Пакуль ідзём ад цэнтра да хаты, архіерэй прыгадвае, як раней тая ці іншая карзуноўская вуліца ў народзе называлася, вітаецца з землякамі. Ён тут свой чалавек, хоць і не жыве ў вёсцы з пачатку 70-х гадоў.

Акуратны дом на два пакоі сустракае цяплом. На печы — «хатні музей». Старадаўні прас, верацяно і іншыя рэчы, якіх у сучасным побыце не сустрэнеш. Падаконнік упрыгожвае талерка з выявай Якуба Коласа, тут жа ляжаць яго кнігі. Чапляецца позірк за бялюткія ручнікі з чырвонай вышыўкай і карункамі, даматканы абрус. «Бабуліныя», — не без гонару заўважае ўладыка. На сцяне два чорна-белыя партрэты: мужчына ў гальштуку і жанчына ў традыцыйным строі. Бацькі?

— Дзед Васіль і баба Агапа. Ім гэты дом і належаў. Дзядулю я не помню, ён загінуў у 44-м, але пакінуў мне спадчыну, — архіерэй дастае «дзедаву бухгалтарскую папку».

Сярод папяровага багацця пасведчанні аб заканчэнні школы і заключэнні шлюбу, працоўныя справаздачы, пісаныя на пачатку 30-х гадоў тарашкевіцай, падзякі ад студэнтаў-практыкантаў, пажоўклыя групавыя фотакарткі, газета з навіной пра крушэнне судна, на якім служыў дзедаў брат, лісты з фронту. Усё дорага ўнуку.

— «Калі дадому не вярнуся, зрабіце каля хаты клумбу з маімі любімымі кветкамі. Ці не рабіце...» — зачытвае ўладыка радкі адной з апошніх вестак. — Дзед Васіль вельмі любіў браткі. Зірніце на яго партрэт: ён якраз упрыгожаны гэтымі засушанымі кветкамі.

## ЧАЛАВЕК АД ЗЯМЛІ

Свецкае імя архіепіскапа Сцяфана — Ігар Корзун. Род яго — сялянскі, на Чэрвеньскай зямлі вядомы з канца XVIII стагоддзя.

— Мы людзі простыя, вясковыя. Хаця да вучобы здольныя. Той жа дзед бухгалтарам стаў. І мне хацелася вучыцца. Раней дзеці ішлі ў школу у сем гадоў, але я, узяўшы сшытак з алоўкам, прыйшоў у першы клас на год раней. «Не дарос яшчэ», — астудзілі запал настаўнікі і адправілі дамоў. Словамі не перадаць, як я тады галасіў! — з усмешкай прыгадвае суразмоўнік. — Пасля школы, доўга не думаючы, паступіў у сельскагаспадарчы тэхнікум. Здавалася, жыццёвы шлях вызначаны — буду аграномам.

Калі ва ўладыкі запытацца, як ён прыйшоў да веры, абавязкова пачуеш жартаўлівы адказ: «Да манаства пачаў рыхтавацца ў арміі. Тры года правёў сярод туркменскіх пустынь».

— Служыць было цікава. Першы год давялося быць страявым салдатам у войсках супрацьпаветранай абароны, а пасля мяне прызначылі старшым важатым службовых сабак, вартаваць пазіцыю нашай часці. Усяго багацця — сем худзенькіх свінак, хоць рэбры пералічвай. Аднойчы азербайджанец, што іх даглядаў, захварэў. Суткі вайсковая скацінка стаяла галодная. А раніцай мне, як вясковаму хлопцу, далі каманду — карміць парсючкоў. Пакуль я служыў, статак вырас да сямі дзясяткаў ладных свіней. Ніколі не забуду, як генералы, перш чым правяраць пазіцыі, заходзілі палюбавацца на свінаферму.

Пасля службы малады аграном вярнуўся на радзіму. Працаваў на зямлі, як і ягоныя продкі, але жаданне звязаць лёс са служэннем Богу не пакідала. Употайкі ездзіў у мінскія храмы.

Для распаўсюджвання ляснай прэсы спецыяльна падбіралі людзей, якія расклейвалі газеты не толькі на слупах і сценах дамоў, але і пранікалі ў фашысцкія адміністрацыі. Неабходны былі выданні агітатарам, якія збіралі па вёсках сялян і арганізоўвалі гучныя чыткі. Уласна і самі партызаны дастаўлялі такую пошту людзям.

«Разведчыкі, падрыўнікі, баявыя падраздзяленні не хацелі ісці на баявыя аперацыі без газеты. Кожны стараўся захапіць з сабой як мага болей экзэмпляраў «Молодого мстителя». Але паколькі яе тыраж быў абмежаваны з-за недахопу паперы, партызаны лічылі сваім абавязкам, вяртаючыся з баявога задання, прынесці хоць крыху паперы», — чытаю ў кнізе «Партызанскія былі».

Паперу не толькі захоплівалі ў ворага, але і збіралі ў насельніцтва. Калі будзеце працаваць з партызанскімі газетамі, якія захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы, альбо праглядаць іх дзякуючы электроннаму выданню, заўважыце, што асобныя нумары надрукаваны на разлінеенай паперы. У той час у справу ішлі вучнёўскія сшыткі, шпалеры, абгортачная папера. З-за недахопу сыравіны тыраж падпольных газет быў невялікім. Ды і фармат ляснай прэсы быў у палову, чвэрць, а то і на 1/8 звычайнага газетнага артыкула.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**


**Клішэ на дрэве.
Зробленае для падпольных газет партызанам Лідскага злучэння Е. В. Разанавым.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 40 (436)

# У РЫТМАХ ЧАСУ

## XXXI Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі IFMC пройдзе на пляцоўках Віцебска, Мінска і Гомеля

**У першыя гады існавання ён праходзіў як нефармальная маладзёжная тусоўка, потым атрымаў даволі экзатычную назву Усесаюзны фестываль папулярнага танца «Белы сабака» і, па сутнасці, стаў той культурнай з'явай, якая дала штуршок да развіцця сучаснага танца ў нашай краіне. Праз трыццаць гадоў фестываль мае падтрымку Міністэрства культуры і Вялікага тэатра Беларусі, заслужаны статус міжнароднага, маштабную геаграфію ўдзельнікаў і штогод адкрывае для шырокай публікі новыя цікавыя імёны і кірункі харэаграфіі.**

Асноўным мерапрыемствам харэаграфічнага форуму, які адбудзецца з 20 па 25 лістапада, стане конкурс сучаснай харэаграфіі. Як расказалі арганізатары, традыцыйна ён праходзіць па такой схеме: у няцотны год фэсту адбываецца нацыянальны беларускі конкурс, у цотны — міжнародны. Сёлета заяўкі на ўдзел у ім даслалі 63 краіны, у тым ліку Арменія, Італія, Германія, Польшча, Расія, Кітай, а таксама Куба, якая будзе прадстаўлена ўпершыню. «Калі б мы дапусцілі да ўдзелу ўсе заяўленыя пастаноўкі, іх агульная працягласць склала б 37 гадзін!» — называе ўражальную лічбу аўтар ідэі і дырэктар фестывалю, **намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра культуры «Віцебск» па спецпраектах Марына РАМАНОЎСКАЯ.** Аднак да гледача дойдуць толькі найлепшыя сярод найлепшых: пасля папярэдняга завочнага адбору вызначыліся 36 калектываў, якія прадставяць на суд міжнароднага журы ў закрытым туры 64 работы, а работы фіналістаў у трэцім, публічным туры конкурсу можна будзе ўбачыць 24 лістапада на сцэне канцэртнай залы «Віцебск». Пераможцы, акрамя ганаровых дыпломаў і звання лаўрэатаў, атрымаюць у дадатак грашовыя прэміі: Гран-пры ў памеры 5700 долараў ЗША, першая прэмія — 3500, другая і трэцяя — 2300 і 1200 адпаведна. Дадаткова будуць уручаны спецыяльныя прэміі «За сэнсавае напаўненне танца», «Постскрыптум» і прэмія імя Яўгена Панфілава — найлепшаму харэографу па версіі міжнароднага журы.


Фота БелТА.

Леташняе 30-годдзе фестывалю вырашылі адзначаць маштабна: і сёлета таксама прадставіць як мага больш відовішчных і вялікіх спектакляў на віцебскай сцэне. Зрэшты, не толькі на віцебскай: IFMC-2018 адкрыецца 20 лістапада на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета ў Мінску — пастаноўкай «Уверцюры Расіні», якую прадставіць італьянскі калектыў Spellbound contemporary ballet. Яе ж 22 лістапада замежныя госці пакажуць у Гомелі, а 25 лістапада — у Віцебску. «У італьянскай трупы вельмі цікавая і дарагая пастаноўка, якая стала пераможцам нацыянальнага конкурсу, што міністэрства культуры Італіі праводзіла да 150-годдзя Расіні, — анансуе Марына Раманоўская. — Дэкарацыі зроблены ў выглядзе вялізнай шафы з мноствам палічак і шуфлядак, у кожнай з якіх — музыка Расіні. А сама шафа нібыта знаходзіцца ў пакоі кампазітара, і гледачы ў зале змогуць праз музыку і пластыку ўбачыць усё яго жыццё, усе захапленні і страхі...»

Акрамя таго, у «вялікай, шыкоўнай і пышнай» праграме сёлетняга фестывалю — спектакль «Калігула», пастаўлены паводле аповесці Альбера Камю Маскоўскім губернскім тэатрам пад кіраўніцтвам Сяргея Бязрукава (у 1,5-гадзіннай пластычнай версіі, дзе няма ніводнага слова, тым не менш іграюць драматычныя акцёры, сярод якіх узыходзячая зорка кіно Кацярына Шпіца), а таксама балет «Спячая прыгажуня» тэатра «Кіеў мадэрн-балет», у якім харэограф Раду Паклітару сумесна з швейцарскім мастаком-пастаноўшчыкам спалучыў эфектнасць класічнага балета і характво дзіцячай казкі, перформанс «Паветра» ў пастаноўцы беларускай танцоркі і харэографа Вольгі Лабоўкінай і тры разнапланавыя спектаклі ад пермскага тэатра «Балет Яўгена Панфілава» — балет-сюіта Tolstoy паводле твораў класіка, сучасны балет «Паноптыкум» і спектакль-трыб'ют «Зорка 62090», пастаўлены на музыку... Віктара Цоя.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

MINSK international film festival LISTAPAD

# УСЁ ПАЧАЛОСЯ З «ХАЛОДНАЙ ВАЙНЫ»

## Учора «Лістапад» адкрыўся — сёння гледачы пачынаюць глядзець конкурсныя праграмы

**Старт 25-му Мінскаму міжнароднаму кінафестывалю дадзены: учора, 2 лістапада, адбыліся першыя паказы ігравога і дакументальнага кіно, а ў кінатэатры «Масква» разаслалі чырвоную дывановую дарожку, разбілі талерку аб штатыў кінакамеры і паказалі фільм адкрыцця, якім на гэты раз стала польская карціна Паўла Паўлікоўскі «Халодная вайна». З чалавечымі камедыямі, (не)дзіцячымі гісторыямі, Карнеліу Парумбою, сімвалічнымі і літаральнымі знакамі старту кінафестываль «Лістапад» аб'яўлены адкрытым.**



Калі ў мінулыя гады чырвонай дарожкай станавіліся падсвечаныя чырванню прыступкі кінатэатра «Масква», дзеля юбілейнага Мінскага кінафестывалю арганізатары цырымоній паклапаціліся аб тэкстылі. Госці «Лістапада» — сябры журы, стваральнікі фільмаў, ганаровыя візіцёры Святлана Немаляева і Рустам Сагдулаеў — падымаліся па прыступках «Масквы», ідучы па сапраўднай дывановай дарожцы.

Юбілей, як звычайна, дае нагоду не толькі для святкавання і асаблівых інтанацый падчас цырымоній, але і для падвядзення вынікаў. Пакуль адкрываўся 25-ы па ліку Мінскі кінафестываль, можна было ўспомніць, як усё пачыналася і развівалася на працягу цэлай чвэрці стагоддзя. Першыя кінапаказы ў агромністым кінатэатры «Кастрычнік», «фестываль постсавецкага кіно», Расціслава Янкоўскага як ганаровага старшыню «Лістапада» і яго традыцыю чытаць вершы на адкрыцці. Гасцей, што прыязджалі на «Лістапад», — Алега Янкоўскага (аднаго з самых частых наведвальнікаў форуму), Кшыштафа Занусі, Клер Дэні, Андрэя Звягінцава, Фані Ардан, Брыянтэ Мендосу, Бенедыка Флігаўфа, Дэні Катэ.

Хутка будзе дзесяцігоддзе, як форумам займаецца сённяшняя дырэкцыя — Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «Арт Карпарэйшн». За гэты час «Лістапад» набыў статус міжнароднага кінафестывалю, атрымаў часовую, а потым пастаянную акрэдытацыю Міжнароднай федэрацыі асацыяцый кінапрадзюсараў FIAPF, замяніў журы кінапрэсы на журы FIPRESCI — Міжнароднай федэрацыі кінакрытыкаў, якая ўручае свае ўзнагароды на такіх кінафестывалях, як Канскі альбо Берлінскі. Адным словам, да 25-годдзя «Лістапад», здаецца, падышоў з высока паднятай галавой.

Рэтраспекцыя ў мінулае — а яна і так удзельнічае ў цырымоніях адкрыцця — сёлета мае асаблівае значэнне, але ў іншым, здаецца, кінафестываль усё той жа. У кінатэатрах паказваюцца фільмы, свае работы прадстаўляюць стваральнікі, у якасці сімвалічнага старту аб штатыў разбіваецца талерка, на цырымоніі ўручаюцца прызы.

Датычна апошняга. Вядома ж, невыпадкова ў Мінску з'явіліся ганаровыя госці. Рамэа з фільма «У бой ідуць адны «старыя», акцёр і рэжысёр з Узбекістана Рустам Сагдулаеў падняўся на сцэну, каб з рук намесніка прэм'ер-міністра Ігара Петрышэнкі атрымаць прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве». Актрыса тэатра і кіно, асабліва вядомая сваімі ролямі ў фільмах Эльдара Разанава, Святлана Немаляева атрымала спецыяльны прыз Выканаўчага камітэта Садружнасці Незалежных Дзяржаў «Кіно без межаў» за развіццё культурнага супрацоўніцтва і ўмацаванне дружбы паміж народамі.

Разам з Генадзем Давыдзькам — з Марыяй Васілевіч ён быў вядучым цырымоніі адкрыцця «Лістапада» — ганаровыя госці кінафестывалю падышлі да штатыва і разбілі талерку. Напэўна, такая масавасць фармальна і вылучае сёлетнюю цырымонію.

Як бы гэта ні адбывалася, галоўнае здарылася: 25-ы «Лістапад» аб'яўлены адкрытым. І сёння гледачы пачынаюць глядзець конкурсныя праграмы, якіх на кінафестывалі шэсць, і працягваюць спазнаваць пазаконкурс. Са 167 карцін дакладна ёсць што выбраць: тут проста бездань праграм, сфакусаваных на спорце, кіно для дзяцей і юнацтва, кінематаграфістах-пачаткоўцах, славенскіх фільмах, работах Аньес Варда і іншым. Нарэшце, увагу прыцягваюць фестывальныя хіты, Ларс фон Трыер, Сяргей Лазніца, карціны з лонг-ліста «Оскара».

Сёння ж, 3 лістапада, у «Піянеры» адбудзецца адкрыццё — асобная цырымонія — «Лістападзіка», у якой паўдзельнічаюць прадзюсар Чын-ю Яо і рэжысёры Моаніка Сіймец і Алдзіяр Байракімаў, фільмы якіх трапілі ў конкурс. Абмеркаванне стужак «Лістападзіка» будзе адбывацца з удзелам мадэратараў — пісьменніцы і лаўрэата літаратурных прэмій «Пунсовыя ветразі» і «Запаветная мара» Яўгеніі Пастэрнак і аўтара кніг для падлеткаў і сцэнарыста Андрэя Жвалеўскага.

Рэкордная колькасць фільмаў сёлета ўдзельнічае ў Конкурсе нацыянальных кінашкол, што задумваўся як майстар-клас, аператварыўся ў паўнавартасную конкурсную праграму, у якой сёлета, дарэчы, прымуць удзел найвядомейшыя еўрапейскія кінашколы. Кінематаграфісты-пачаткоўцы, бо для іх гэтая секцыя найбольш цікавая, змогуць убачыць 25 работ, калі ў мінулым і пазамінулым гадах паказвалася 14 і 16.

Нацыянальны конкурс будзе паказвацца з 6 да 8 лістапада ў кінатэатры «Беларусь». Улічваючы апошнія хваляванні, у ім сёлета ўдзельнічае не 20, а 18 ігравых, дакументальных і анімацыйных карцін.

Як звычайна, фільмы, што ўдзельнічаюць у конкурсах «Лістапада» (на жаль, не ўсе, але ўсё ж) будуць прадстаўлены іх стваральнікамі — з імі ж пасля прагляду можна будзе абмеркаваць убачанае ў фармаце Q&A.

Вынікі конкурсаў стануць вядомыя на цырымоніі закрыцця кінафестывалю 9 лістапада зноў жа ў кінатэатры «Масква». Толькі адзначу: фільмы, што былі адабраны ў праграмы «Лістапада» ці атрымалі яго ўзнагароды, часта маюць добры працяг у фільмаграфіі аўтараў альбо фестывальным лёсе.

Асноўнымі пляцоўкамі Мінскага кінафестывалю сёлета з'яўляюцца кінатэатры «Цэнтральны», «Мір», «Піянер», «Беларусь», «Масква», «Falcon Club Буцік Кіно» і Музей гісторыі беларускага кіно.

Усё толькі пачынаецца.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

Музыка

# Як гучыць восень

44-ы міжнародны фестываль мастацтваў «Беларуская музычная восень», арганізатарам і галоўнай пляцоўкай якога выступае Белдзяржфілармонія, пачаўся ў сталіцы. Гэтым разам у праграме — каля 20 канцэртаў найлепшых музыкаў і калектываў з 12 краін свету.

На працягу амаль месяца, да 28 лістапада, меламаны змогуць наведаць канцэрты на розны густ: сімфанічныя, джазавыя, харавыя, народныя музычныя вечары. Ёсць у праграме і некалькі цікавых прэм'ер. Так, 13 лістапада прагучаць творы сучаснага італьянскага кампазітара Раберта Малінэлі, музыку якога, падкрэсліваюць арганізатары «Беларускай музычнай восені», раней ніколі не чулі ў нашай краіне. А 18 лістапада будзе прадстаўлена сусветная прэм'ера — вялікая сімфонія айчыннага аўтара Ларысы Сімаковіч «Скарына. Вяртанне» — сем сцэн з жыцця асветніка і першадрукара, якія разам з хорам і аркестрам прадставіць рок-выканаўца Ян Жанчак.

Таксама ў межах фестывалю пройдзе цэлы музычны марафон, прымеркаваны да 80-годдзя галоўнага дырыжора Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя Жыновіча прафесара Міхаіла Казінца.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**



Прэм'ера

# БЕЛАРУСЬ XVI СТАГОДДЗЯ НА СЦЭНЕ ВЯЛІКАГА ТЭАТРА

## Як інтэрпрэтаваць мінулае, каб расказаць рамантычную гісторыю

**Мы чакалі ад тэатра оперы і балета чыста беларускай пастаноўкі і дачакаліся «Анастасіі» — страшна прыгожага двухактовага балета пра Анастасію Слуцкую, татарскія напады і каханне. Музыка Вячаслава Кузняцова, лібрэта Анатоля Дзялендзіка (аўтара сцэнарыя кінафільма «Анастасія Слуцкая»), харэаграфія Юрыя Траяна і эпізод з беларускай гісторыі, які мы мала ведаем, таму можам па-рознаму абыгрываць, увасобіліся ў новай пастаноўцы Вялікага.**

Тэатр, бывае, папракаюць у тым, што айчыннага прадукту ў ім не знойдзеш днём з агнём. Пакуль на яго сцэне спявае Кармэн і танцуе Жызэль, да беларускага гэта мае дачыненне толькі творчым складам каманды, што працуе над пастаноўкамі. Балет «Анастасія», што звяртаецца да XVI стагоддзя ў нашай гісторыі і жыцця вымушанай быць моцнай, каб абараніць сваіх дзяцей і горад, жанчыны, нейкім чынам запаўняе прабел у рэпертуары. Па-першае, праз гісторыю беларускай зямлі, па-другое, праз матэрыял беларускіх творцаў.

Вытанчанымі рухамі пад вартую асобнай увагі музыку Вячаслава Кузняцова артысты балета расказваюць гісторыю галоўнай гераіні: Анастасія мае пэўныя пачуцці да князя Міхаіла Глінскага, ці то ў сне, ці то насамрэч, але выходзіць замуж за выбранага бацькам Сямёна Алелькавіча. Саюз падмацоўваецца сапраўдным каханнем і абарочваецца сямейнай ідыліяй з дваімі дзеткамі, але жыццё князя Сямёна мусіць перарвацца праз рантоўны напад Хана Ахмата і яго дачкі Заіры. Апошняя хітрым і несправядлівым ударам нажом у спіну забівае князя, а Анастасія ў сетцы аказваецца падарункам Міхаілу Глінскаму. Другі акт аддадзены іх стасункам: Анастасія прагане Міхаіла, а ён выратоўвае яе падчас чарговага нападу татар.

У выпадках работы з такімі малавядомымі перыядамі застаецца шмат прасторы для аўтарскіх варыяцый і спакусы іх рамантызацыі. Што стала і з гісторыяй пра Анастасію Слуцкую: гістарычны фон з'яўляецца толькі кантэкстам, што рухае сентыментальны сюжэт і праяўляе герояў. Беларуская праваслаўная зямля церпіць ад вераломства іншаверцаў, але галоўнае тут усё ж любоўны трыкутнік — цудоўны саюз Анастасіі з Сямёнам, каб аб яго смерці больш перажывалі, цвёрдасць духу галоўнай гераіні, якая не прымае Міхаіла Глінскага, і ўчынак апошняга, ад рамантычнасці якога сэрца можа спыніцца, калі ён нягледзячы ні на што выратоўвае Анастасію і яе горад ад ліхадзеяў-татар.

**Тэатр расказвае гісторыю з мінімалісцкімі, але шматграннымі дэкарацыямі, паветранымі сукенкамі і сабалямі на плячах, энергічным Ханам Ахматам, хітрым выгінаннем Заіры, настойлівым збіраннем войска Анастасіяй.**

Другі раз запар — мы памятаем пастаноўку «Саламея», прэм'ера якой пераносілася бацькам з-за скаргі вернікаў — Вялікі тэатр расказвае гледачам пра жыццё рашучай, моцнай, смелай жанчыны, што аддана кахае, заварочвае свет вакол сябе і рухае гісторыю. Прычым расказвае з мінімалісцкімі, але шматграннымі дэкарацыямі, лёгкімі сукенкамі і сабалямі на плячах, энергічным Ханам Ахматам, хітрым выгінаннем Заіры, настойлівым збіраннем войска Анастасіяй.

Напэўна, ёсць у пастаноўцы рэверанс у бок праваслаўя, якое маецца на ўвазе ў дэкарацыях і палымяных зваротах Анастасіі да Бога ў цяжкую хвіліну. Ну і нічога, каб не абсалютныя злачынцы без прынцыпаў татары, хаця ў цэлым балет пазбегнуў спрошчаных абсалютаў, маўляў, калі каханне, дык назаўсёды, калі ты моцная, дык усіх пераможаш. Ёсць тут нават са зваротам да гісторыі адначасовае яе адмаўленне, таму што яна служыць толькі нагодай расказаць пра каханне (ці каханні), у якое можна як мага больш дадаць ад сябе.



**Балет «Анастасія» звяртаецца да XVI стагоддзя ў нашай гісторыі і жыцця вымушанай быць моцнай, каб абараніць сваіх дзяцей і горад, жанчыны.**

Але музыка, мова цела (усё ж балетнае мастацтва — вялікае) і незалежны шматок беларускай зямлі — у прэм'ернай пастаноўцы тэатра оперы і балета. Дакладна (калі не шукаць паўтораў і нестыковак) новы беларускі праект Вялікага, які перанёс нашае XVI стагоддзе на сцэну, паказвае, што зварот да гісторыі можа даць бездань магчымасцяў для стварэння відовішчнага балета.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**

Выстаўка

# ЗБОРная па мастацкіх відах...

**«Беларусь і сучаснае мастацтва» — тэма, што яднае адразу некалькі плоскасцяў, у якіх могуць выказвацца не толькі гледачы і мастацтвазнаўцы. Але тэма патрабуе нават філасофскага разгляду. Пазачасовага — як сама Беларусь і само мастацтва. І вось пункт у прасторы і часе, дзе яны сыходзяцца...**

Умоўна можна яго вызначыць па месцы правядзення выставачнага праекта «*ZBOR In Progress*», адпаведна, — гэта галерэя сучаснага мастацтва «Ў». Але гэта было б занадта проста для сучаснага мастацтва. І па факце аказваецца, што Беларусь можна шукаць па ўсім свеце (як творцаў, што яе прадстаўляюць ці пра яе ствараюць). І за праектам ZBOR фактычна можна было сачыць ужо некалькі дзесяцігоддзяў. Бо насамрэч тое маштабнае даследаванне гісторыі сучаснага мастацтва Беларусі ахоплівае гадоў 30 як мінімум, калі гэтае мастацтва стала вырывацца вонкі нягледзячы на гатоўнасць (ці негатоўнасць) айчыннага грамадства з ім сутыкацца.

Цяпер, канешне, можна называць канкрэтную дату, калі пачаў паўставаць выставачны праект ZBOR: даследчыцкая платформа KALEKTAR была створана групай мастакоў і куратараў у 2014 годзе, каб праз сеціва прадстаўляць беларускае мастацтва, што ствараецца цяпер. Але ж глеба рыхтавалася даўно — асобнымі аўтарамі ці ў супольнасці. Ды і сузаснавальнікі платформы KALEKTAR Сяргей Кірушчанка і Сяргей Шабохін добра вядомыя тым, хто ў Беларусі ходзіць на сучасныя выстаўкі. Іх было ўжо шмат за дзесяцігоддзі — яркіх і спрэчных, канцэптуальных і часам адчайных — калі мастацтва імкнулася, як люстэрка, адлюстраваць нас жа сённяшніх, паказаць адбіткі, зафіксаваныя творцамі з пільным поглядам на людзей ды на жыццё. І ніхто ж не абяцаў, што гэты погляд будзе «адфоташоплены». Ні ў якім разе! — заклікалі мастакі. Толькі непрыхаваны (але мы не заўсёды бачым сябе ў парадней форме?) і лепш, каб канцэптуальны. Ох!..

Не, куратары праекта «Zbor in progress» Максім Тымінько і Андрэй Дурэйка выдатна ведаюць, што гэта такое. І справядліва разлічваюць, што глядач будзе цягнуцца ўслед за імі, уздымаць свой узровень разумення мастацтва. Недзе так і ёсць: нашых творцаў, што практыкуюць сучаснае мастацтва, разумеюць (і з задавальненнем прымаюць на жыхарства і з выстаўкамі) у розных краінах. І з умоўным «зборам» беларускага сучаснага мастацтва ўжо азнаёміліся нашы суседзі ў Польшчы і ва Украіне (пасля чаго рэзананс і адзнакі былі асабліва значнымі). І вось Радзіма... Нібыта прымяраліся і наважваліся, рызыкавалі і шукалі месца пад сонцам. Тое, што яно ў прынцыпе цяпер ёсць, — ужо прагрэс, бо калі нейкія галерэі заяўляюць сучаснасць як прыярытэт, гэта гаворыць пра тое, што запыт на яе ёсць. Мастакі ідуць!

Іх нямала. Для выстаўкі ў Мінску творы адбіралі, каб прадставіць найбольш важныя тэндэнцыі, у якіх выяўляюцца беларускія мастакі. Мінская выстаўка прадстаўляе больш чым пяцьдзясят творцаў, якія жывуць і працуюць як у нашай краіне, так і за яе межамі. Разам — больш за дзвесце работ, што былі створаны з канца 80-х гадоў мінулага стагоддзя да нашых дзён у розных кірунках. Але ёсць такія творы, з якімі складана пазнаёміцца наўпрост, але неабходна, і дапамагае вялікі экран і медыяпрэзентацыя: арыгінальныя відэатворы больш чым дваццаці аўтараў, рэдкія дакументальныя відэаматэрыялы асобных перформансаў і мастацкіх акцый. І як ва ўсім гэтым разабрацца з ходу, калі не ведаў (назіраў) перадгісторыю? Таму прадумана і суправаджэнне праекта: сустрэчы з мастакамі, лекцыі, дыскусіі, куратарскія экскурсіі па экспазіцыі, якая прадоўжыцца да канца лістапада.



*Жанна ГРАК:*
**інсталяцыя «Насценны малюнак».**

Але найбольш важна нават не гэта, таму што любая экспазіцыя мае ўласцівасць заканчыцца. Сам праект будзе працягвацца ўсё адно і скрупулёзна фіксаваць і замацоўваць у гісторыі імёны і творы праз стварэнне анлайн-калекцыі, якая фарміруецца праз экспертныя ацэнкі і меркаванні. Яна ўжо змяшчае больш за 150 твораў. І тут не мае значэння, у якой частцы свету жыве аўтар. Тут яны ўсе беларускія, тут яны працягваюць весці дыялог з тымі, хто застаецца ў галоўнай прасторы, якую сучаснае мастацтва імкнецца ўдасканальваць. А яно, якое б ні было — іранічнае ці інтрыгуючае, гучнае ці спрэчнае, — усё адно пра нас. Не падменіш. Не падманеш...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 04.12.2018 г в 15.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100005000819 г. Смолевичи, ул. Михайловская (участок № 2)<br>Лот № 2 – площадь 0,1137 га, кадастровый номер 624850100005000822 г. Смолевичи, ул. Короткевича (участок № 2)<br>Лот № 3 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000730 г. Смолевичи, ул. Владимира Купревича, 27<br>Лот № 4 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000528 г. Смолевичи, ул. М.Огинского, 11<br>Лот № 5 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000735 г. Смолевичи, ул. Утульная, 5<br>Лот № 6 – площадь 0,1500, кадастровый номер 624850100009000001 г. Смолевичи, ул. С. Станюты, 46<br>Лот № 7 – площадь 0,1498 га, кадастровый номер 624850100001001009 г. Смолевичи, ул. Ивана Шамякина, д. 1 |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельных участков | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
| 7 | Начальная стартовая цена | Лот № 1 – 30 000 рублей;<br>Лот № 2 – 30 000 рублей;<br>Лот № 3 – 17 000 рублей;<br>Лот № 4 – 17 000 рублей;<br>Лот № 5 – 17 000 рублей;<br>Лот № 6 – 17 000 рублей;<br>Лот № 7 – 17 000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь;<br>В) наличие не менее двух участников;<br>Г) без права предоставления рассрочки;<br>Д) получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома.<br>Восстановить границы земельного участка за счет средств победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона.<br>Приступить к занятию (освоению) земельного участка в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав на него |
| 9 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 10 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10 % от начальной стартовой цены на р/с BY98 AKBB36410000006696200000, БИК AKBBBY21612 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиала 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Борисов, пр-т Революции, 47 УНП 600014139, ОКПО 04064735 (с пометкой «задаток за земельный участок») |

**Расходы по организации и проведению аукциона: лот № 1 – 1711,97, лот № 2 – 17931,33, лот № 3 – 864,54, № 4 – 78,40, № 5 – 864,54, № 6 – 73,50, № 7 – 1902,35, затраты на публикацию и размещение в сети Интернет информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона. Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».**

**Порядок предварительного ознакомления на местности с продаваемым земельным участком – каждый четверг с 9.00 до 13.00.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 119.**

**Окончательный срок приема заявлений – 28.11.2018 г. 17.00.**

Контактный телефон (8 01776) 2-73-42.

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

– заявление на участие в аукционе по установленной форме;

– документ подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);

– физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

## РУП «Белпочта», Минский филиал объявляет о проведении переговоров (без процедуры предварительного квалификационного отбора с улучшением предложений для переговоров) по выбору подрядной организации для выполнения строительных работ по объекту: «Гидравлические испытания и гидропневмопромывки систем теплоснабжения (второй этап)»

Предложения для переговоров принимаются до 09.00 9 ноября 2018 года:

– почтой по адресу: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 5/3 (с отметкой «в комиссию по проведению переговоров»);

– нарочным по адресу: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 5/3, каб. 109 (понедельник – четверг – с 8.30 до 17.15, пятница – с 8.30 до 16.15).

Контакты для получения дополнительной информации: отдел эксплуатации зданий и сооружений Минского филиала РУП «Белпочта» – тел. 2648988).

УНП 101120215

# РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ШАГАЕМ В ШКОЛУ С ШАГОВИТА!»

shagovita В КАЖДОМ ШАГЕ

Организатор рекламной игры: ЗАО «Сэлмон-Графикс», юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, пом. 11, ком. 43.

УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.

Рекламная игра называется «Шагаем в школу с Шаговита!».

Срок проведения рекламной игры: в период **с 10 августа 2018 года по 6 ноября 2018 года** (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

Территория проведения рекламной игры: фирменные магазины ЗАО ТД «Шаговита», расположенные на территории Республики Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3346, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 7 августа 2018 г.

В рекламной игре приняло участие 15 472 (пятнадцать тысяч четыреста семьдесят два) физических лица.

Призовой фонд разыгран полностью.

Список победителей рекламной игры **«Шагаем в школу с Шаговита!»**

| № п/п | Номер Участника | ФИО победителя | Населенный пункт |
|---|---|---|---|
| Розыгрыш № 1 | | | |
| Приз № 1 – смартфон Apple iphone 7 32 gb black стоимостью 1440,00 белорусских рублей + денежный приз в размере 196,94 белорусского рубля | | | |
| 1 | 26 407 | Стешенок Екатерина Анатольевна | г. Гомель |
| Приз № 2 – подарочный сертификат «Shagovita» на сумму 50 белорусских рублей. Срок действия сертификата – по 31.12.2018 г. | | | |
| 2 | 22157 | Бегунов Андрей Владимирович | г. Минск |
| 3 | 22257 | Матиевская Анна Игоревна | г. Минск |
| 4 | 22357 | Титовец Екатерина Александровна | г. Минск |
| 5 | 22457 | Винокурова Галина Михайловна | г. Гомель |
| 6 | 22557 | Фролова Александра Анатольевна | г. Минск |
| 7 | 22657 | Волкова Лариса Викентьевна | г. Вилейка |
| 8 | 22757 | Беспуда Светлана Николаевна | г. Брест |
| 9 | 22857 | Карпович Елена Сергеевна | г. Калинковичи |
| 10 | 22957 | Богданович Андрей Сергеевич | г. Калинковичи |
| 11 | 23057 | Одинец Наталья Владиславовна | г. Жодино |
| 12 | 25157 | Стасько Наталья Васильевна | г. Гродно |
| 13 | 23257 | Кожецкий Андрей Мечиславович | г. Гродно |
| 14 | 23357 | Шиманович Елена Ивановна | г. Минск |
| 15 | 23457 | Давыдов Владимир Александрович | г. Могилев |
| 16 | 23557 | Кацубо Светлана Ивановна | г. Гомель |
| 17 | 23657 | Петухова Елена Александровна | г. Полоцк |
| 18 | 23757 | Шталь Регина Сергеевна | г. Солигорск |
| 19 | 23857 | Костюков Александр Анатольевич | г. Круглое |
| 20 | 23957 | Чайко Сергей Николаевич | г. Осиповичи |
| 21 | 24057 | Наранович Ирина Николаевна | г. Минск |
| 22 | 24157 | Каленкович Наталья Николаевна | г. Лунинец |
| 23 | 24257 | Дирша Снежана Владимировна | г. Волковыск |
| 24 | 24357 | Терешкова Анна Леонидовна | г. Барановичи |
| 25 | 24457 | Бохан Елена Михайловна | п. Юбилейный |
| 26 | 24557 | Кравцова Алеся Викторовна | г. Могилев |
| 27 | 24657 | Тараненко Инна Валерьевна | г. Минск |
| 28 | 24757 | Лукашевич Анастасия Игоревна | г. Лида |
| 29 | 24857 | Стрижонок Дмитрий Александрович | г. Витебск |
| 30 | 24957 | Казакевич Татьяна Евгеньевна | г. Могилев |
| 31 | 25057 | Харитонова Янина Владимировна | г. Могилев |
| Розыгрыш № 2 | | | |
| Приз № 1 – смартфон Apple iphone 7 32 gb black стоимостью 1440,00 белорусских рублей + денежный приз в размере 196,94 белорусского рубля | | | |
| 1 | 10357 | Врубель Екатерина Ивановна | г. Брест |
| Приз № 2 Подарочный сертификат «Shagovita» на сумму 50 белорусских рублей. Срок действия сертификата – по 31.12.2018 г. | | | |
| 2 | 17210 | Летун Дарья Сергеевна | г. Брест |
| 3 | 17310 | Петровский Николай Николаевич | г. Могилев |
| 4 | 17410 | Синчук Марина Валерьевна | г. Минск |
| 5 | 17510 | Скакун Екатерина Владимировна | аг. Слобода |
| 6 | 17610 | Ярошевич Полина Сергеевна | г. Минск |
| 7 | 17710 | Богомья Алла Николаевна | г. Мазолово |
| 8 | 17810 | Ахрем Дмитрий Вячеславович | г. Брест |
| 9 | 20710 | Зарембо Ирина Алексеевна | г. Минск |
| 10 | 17910 | Самакалева Ольга Павловна | г. Витебск |
| 11 | 18010 | Остроушко Светлана Эдуардовна | г. Минск |
| 12 | 18110 | Протасеня Инна Александровна | г. Солигорск |
| 13 | 18210 | Власова Юлия Олеговна | г. Могилев |
| 14 | 18310 | Воронцова Екатерина Геннадьевна | г. Могилев |
| 15 | 18410 | Янушкевич Анастасия Викторовна | г. Минск |
| 16 | 18510 | Телешева Алла Андреевна | п. Ченки |
| 17 | 18610 | Гриневич Инна Григорьевна | г. Лунинец |
| 18 | 18710 | Будай Марина Сергеевна | г. Минск |
| 19 | 18810 | Овчинникова Ирина Александровна | г. Гомель |
| 20 | 18910 | Щурок Александр Анатольевич | г. Борисов |
| 21 | 19010 | Чакур Ксения Олеговна | г. Солигорск |
| 22 | 19110 | Цудило Екатерина Павловна | г. Пинск |
| 23 | 19210 | Кунда Екатерина Валерьевна | г. Минск |
| 24 | 19310 | Валько Раиса Владимировна | г. Жодино |
| 25 | 19410 | Шиляева Светлана Владимировна | г. Брест |
| 26 | 19510 | Абрамчук Наталья Леонтьевна | г. Брест |
| 27 | 19610 | Орлова Кристина Александровна | г. Минск |
| 28 | 19710 | Сердюков Юрий Владимирович | г. Могилев |
| 29 | 19810 | Чуевская Елена Николаевна | г. Минск |
| 30 | 19910 | Чечура Анна Владимировна | г. Солигорск |
| 31 | 20010 | Ефремова Ольга Владимировна | г. Витебск |
| 32 | 20110 | Широгородская Нина Васильевна | г. Гомель |
| 33 | 20210 | Лемешкова Ольга Владимировна | г. Минск |
| 34 | 20310 | Корунная Марина Николаевна | г. Витебск |
| 35 | 20410 | Овсянникова Ольга Викторовна | г. Гомель |
| 36 | 20510 | Карпикова Екатерина Петровна | г. Белыничи |
| Розыгрыш №3 | | | |
| Приз № 1 – Смартфон Apple iphone 7 32 gb black, стоимостью 1440,00 белорусских рублей + денежный приз в размере 196,94 белорусских рублей | | | |
| 1 | 02492 | Ярута Наталья Александровна | г. Минск |
| Приз№ 2 – подарочный сертификат «Shagovita» на сумму 50 белорусских рублей. Срок действия сертификата – по 31.12.2018 г. | | | |
| 2 | 32594 | Стельмашук Ангелина Васильевна | г. Брест |
| 3 | 32694 | Куделич Людмила Валерьевна | г. Пинск |
| 4 | 32794 | Степанюк Кристина Игоревна | г. Брест |
| 5 | 32894 | Непарко Юлия Владимировна | г. Минск |
| 6 | 32994 | Кондратчук Ярослава Владимировна | г. Минск |
| 7 | 33094 | Козельцева Наталья Павловна | г. Брест |
| 8 | 33194 | Рогова Ольга Петровна | г. Минск |
| 9 | 33294 | Бегиашвили Лариса Алексеевна | г. Гомель |
| 10 | 33394 | Дегтярева Татьяна Викторовна | г. Минск |
| 11 | 33494 | Бритько Валерия Валерьевна | г. Гродно |
| 12 | 33594 | Бычкова Татьяна Дмитриевна | г. Гомель |
| 13 | 33694 | Шеметуха Светлана Валентиновна | г. Брест |
| 14 | 00227 | Шмигельская Ирина Леонидовна | г. Пинск |
| 15 | 33894 | Оверчук Андрей Викторович | г. Брест |
| 16 | 33994 | Шацкая Наталья Витальевна | г. Брест |
| 17 | 34094 | Шушкевич Зарина Васильевна | г. Лида |
| 18 | 34194 | Рудаков Евгений Александрович | г. Витебск |
| 19 | 34294 | Вакульчик Татьяна Ивановна | г. Брест |
| 20 | 34394 | Адамович Ольга Сергеевна | г. Минск |
| 21 | 34494 | Прудникова Тамара Николаевна | г. Могилев |
| 22 | 34594 | Дуло Виктория Александровна | г. Гродно |
| 23 | 34694 | Грабинский Сергей Перович | г. Минск |
| 24 | 34794 | Дубцова Татьяна Семеновна | г. Гомель |
| 25 | 34894 | Крупская Юлия Николаевна | г. Гомель |
| 26 | 34994 | Кивака Денис Владимирович | г. Брест |
| 27 | 35094 | Кляшторная Светлана Васильевна | г. Новополоцк |
| 28 | 35194 | Чубис Ирина Владимировна | г. Борисов |
| 29 | 35294 | Терлецкий Игорь Анатольевич | г. Брест |
| 30 | 35394 | Оберемок Ирина Станиславовна | г. Минск |
| 31 | 35494 | Михайлова Ольга Александровна | г. Гродно |
| 32 | 35594 | Тимощенко Елена Викторовна | г. Гродно |
| 33 | 35694 | Акопян Тагуш Овиковна | г. Гомель |
| 34 | 35794 | Рупека Елена Александровна | г. Брест |
| 35 | 00027 | Сеньковец Владимир Иванович | г. Пинск |
| 36 | 00127 | Садюкевич Екатерина Леонидовна | г. Солигорск |
| Приз № 3 – сертификат на туристические услуги на поездку в Диснейленд, на двоих, стоимостью 3000,00 белорусских рублей + денежный приз в размере 430,05 белорусских рублей. | | | |
| 37 | 085261 | Бухалко Диана Игоревна | г. Минск |

Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры + 375 29 505 05 32 (в рабочие дни с 10.00 до 17.00).

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельного участка в частную собственность гражданам для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Организатор аукциона – Жемчужненский сельский исполнительный комитет Барановичского района Брестской области

| № п/п | Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка | Характеристика инженерных коммуникаций | Площадь земельного участка, га | Назначение участка | Начальная цена объекта, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район Жемчужненский с\с, аг. Жемчужный, ул. Изумрудная, 7, кадастровый номер 120481503601000557 | Участок свободен от застройки, рядом водопровод, газопровод, линия электропередачи, грунтовая дорога | 0,1673 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 3131,86 | 313,19 | 1680,59 + расходы на размещение информации в СМИ |

1. Аукцион состоится 6 декабря 2018 года в 15.00 в здании Барановичского райисполкома по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, г. Барановичи, ул. Советская, 79, библиотека райисполкома.

2. Условия аукциона:

– наличие не менее двух участников.

3. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 10 %.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление. К заявлению прилагают:

– заверенную банком копию платежного поручения (квитанции) о внесении задатка;

– копию документа, удостоверяющего личность, (паспорт) покупателя или его доверенного лица;

– доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется до 3 декабря 2018 года до 17.00 на расчетный счет BY25AKBB36412110500311300000, фил. 802 ОАО АСБ «Беларусбанк» код AKBBBY21802 УНП 200046491.

Адрес банка: Брестская область, г. Барановичи, б-р Штоккерау, д. 8а.

Получатель: Жемчужненский сельский исполнительный комитет, 225316, Брестская область, Барановичский район, аг. Жемчужный, ул. Ленина, д. 5.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона может быть продан по начальной цене + 5 % единственному участнику аукциона.

7. Победитель аукциона либо единственный участник аукциона обязан: оплатить в течение 10 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка стоимость объекта продажи и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, по оформлению государственной регистрации создания земельного участка, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи:

каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по телефонам: (8-0163) 656023, 656009.

9. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

10. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 6 ноября 2018 года в комиссии с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в Жемчужненском сельисполкоме. Последний день приема документов – 3 декабря 2018 года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – 6 декабря с 14.00 до 15.00.

К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

11. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести плату за земельный участок; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок, подписать соглашение с Жемчужненским сельисполкомом о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по продаже земельного участка в частную собственность гражданина Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

# У ЧАКАННІ «ВЯЛІКАЙ ДЭПРЭСІІ»




## Ці ўдасца пазбегнуць глабальнага фінансавага калапсу?

**Дзесяць гадоў таму — у 2008-м — разгарнуўся сусветны фінансавы крызіс. Нагадаем, адразу крах пачаўся на іпатэчным рынку ЗША пасля крушэння аднаго з найбуйнейшых у свеце інвестыцыйных банкаў Lehman Brothers. Яго банкруцтва лічыцца зыходным пунктам глабальнага фінансавага крызісу. Зараз сусветная эканоміка апынулася пад новым ударам. Пры гэтым большасць краін, якія пацярпелі ад мінулага крызісу, дасюль не змаглі пераадолець яго наступстваў. Да такой несуцяшальнай высновы прыйшлі эксперты Міжнароднага валютнага фонду (МВФ). У грунтоўным даследаванні арганізацыі былі прааналізаваны пакачыкі развіцця 180 дзяржаў свету. Калі чакаць чарговай «вялікай дэпрэсіі»?**

### Доўг — 182 трыльёны долараў

Сусветная эканоміка — на парозе чарговага фінансавага краху. Цяпер яго трыгерам абяцае стаць велізарны сумарны доўг краін свету. Напярэдадні крызісу 2008 года сярэднія суадносіны глабальнага доўгу да ВУП складалі 36 працэнтаў, а зараз — больш за 50 працэнтаў. Сума астранамічная — 182 трыльёны долараў. Міжнародны валютны фонд папярэджвае: калі фінансавую сістэму не ўдасца рэфармаваць, калапсу не пазбегнуць.

Эксперты арганізацыі канстатуюць: урады большасці краін правалілі практычна ўсе рэформы, якія патрабаваліся для абароны банкаўскай сістэмы — у першую чаргу ад рызыкоўных і неабдуманых дзеянняў фінансістаў, якія выклікалі магутную ланцуговую рэакцыю абвалу дзесяць гадоў таму.

У МВФ прызнаюць: нейкія ўрокі за мінулае дзесяцігоддзе рэгулятарам удалося спасцігнуць — гэта і павелічэнне банкаўскіх рэзерваў, і ўзмацненне жорсткасці нагляду за фінансавым сектарам, але, як адзначаюць у фондзе, прынятых мер аказалася недастаткова.

«Як правіла, рызыкі павышаюцца ў адносна спакойныя перыяды (як цяпер) — з нізкімі працэнтнымі стаўкамі і кантраляванай валацільнасцю. Але гэтыя рызыкі могуць распаўсюдзіцца на іншыя, неабароненыя часткі фінансавай сістэмы», — адзначаецца ў справаздачы.

Адной з крыніц новага крызісу можа стаць Кітай, дзе да пагрозлівых маштабаў пашырыўся сектар ценявога крэдытавання. Аб'ём гэтага сектара дасягнуў амаль сямі трыльёнаў долараў. У МВФ лічаць, што гэтая «бурбалка» здольная абрынуць эканоміку краіны і запусціць новы азіяцкі крызіс, аналагічны абвалу 1997 года. Яшчэ адна нагода для апаскі — рост міжнародных банкаў накшталт JPMorgan і Industrial and Commercial Bank of China ў маштабах, якія перасягаюць найбуйнейшыя фінансавыя ўстановы напярэдадні крызісу 2008 года.

### Спускавы кручок

Драматычныя падзеі ў сусветнай эканоміцы і гандлі адбудуцца ўжо налета, заявілі ў МВФ. Аб'ём глабальнага валавога ўнутранага прадукту знізіцца на 1,9 працэнта, а аб'ём міжнароднага тавараабароту скароціцца на 17 працэнтаў, падлічылі ў арганізацыі. Іншымі словамі, планета сутыкнецца з чарговым усёахопным крызісам, які па сваім напале і наступствах можа перасягнуць крызіс 2008—2009 гадоў. Штуршком да яго паслужыць гандлёвая вайна паміж ЗША і Кітаем.

«Гандлёвыя войны страшныя не самі па сабе. Справа ў тым, што сусветная эканоміка ў прынцыпе саспела для чарговага поўнамаштабнага крызісу цыклічнага характару, — заўважыў у гутарцы з news.ru дырэктар Інстытута стратэгічнага аналізу ФБК Ігар Мікалаеў. — Што рабіць, такая сутнасць рынкавай эканомікі. Калі прасачыць з пачатку 1970-х гадоў, крызісы ў ёй адбываліся з перыядычнасцю ў 8-10 гадоў. У тым, што зусім хутка наступіць новы, асабіста я ніколькі не сумняваюся. На сусветных фондавых рынках цяпер назіраюцца адны суцэльныя «бурбалкі», асабліва вялікая — на амерыканскім».

Узмацненне гандлёвай напружанасці, геапалітычнай нестабільнасці і палітычнай нявызначанасці ў найбуйнейшых эканоміках, гаворыцца ў дакладзе, можа выклікаць «раптоўнае пагаршэнне настрояў інвестараў, справакаваўшы магутнае падзенне на сусветных рынках капіталу і рэзкае ўзмацненне жорсткасці глабальных фінансавых умоў». Паводле ацэнак МВФ, краіны з эканомікай, якая развіваецца (без уліку Кітая), рызыкуюць сутыкнуцца з адтокам капіталу ў аб'ёме больш за сто мільярдаў долараў на працягу чатырох кварталаў запар, што па маштабе супастаўна з сусветным фінансавым крызісам 2008 года.

У Кітаі фінансавыя ўмовы засталіся «ў цэлым стабільнымі» дзякуючы змякчэнню грашоваКрэдытнай палітыкі цэнтральнага банка, заявіў МВФ. Як вядома, у кастрычніку Цэнтрабанк КНР рэзка знізіў рэзервовыя патрабаванні для банкаў, даўшы рынку ліквіднасць больш чым на трыльён юаняў. Рэгулятар абвясціў аб зніжэнні з 15 кастрычніка рэзервовых патрабаванняў для большасці банкаў — гэта ўжо чацвёрты такі крок сёлета.

Спускавым кручком крызісу дзесяцігадовай даўнасці паслужыў крах амерыканскага інвестыцыйнага банка Lehman Brothers, нагадвае эксперт. А зараз, пераканаы ён, такім выступіць менавіта зацяжны гандлёвы канфлікт паміж дзвюма найбуйнейшымі эканомікамі свету. Нездарма асноўнай тэмай штогадовага пасяджэння МВФ, якое прайшло на Балі, цалкам чакана стаў пратэкцыянізм, піша іспанская газета ABC. Паводле ацэнак аналітыкаў фонду, у выпадку развіцця горшага сцэнарыя гандлёвых войнаў, развязаных прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам, сусветная эканоміка панясе шкоду ў 1,52 трыльёна долараў. Гэта супастаўна з памерам ВУП Іспаніі ці Расіі. «На гарызонце з'явіліся аблокі», — вобразна выказаўся галоўны эканаміст арганізацыі Морыс Обстфельд.



### Хваля дэфолтаў

Павышэнне ключавой стаўкі ў Злучаных Штатах можа справакаваць хвалю дэфолтаў у краінах, якія развіваюцца, прагназуе агенцтва Bloomberg. У такіх краін назапасіліся вялікія даўгі ў доларах, а ва ўмовахператоку капіталу ў ЗША долар умацоўваецца і эканомікам, якія развіваюцца, становіцца складаней пагашаць валютныя крэдыты. Каб раздаваць даўгі, Аргенціна афарміла новую пазыку ў МВФ на рэкордную суму ў $57 млрд. Падобная сітуацыя ў Турцыі, ПАР і многіх іншых краінах. «Рынкі, якія развіваюцца і занадта моцна залежаць ад долара і імпарту нафты, — самыя ўразлівыя», — ацаніў сітуацыю старшы эканаміст ганконгскага Maybank Kim Eng Хак Пінь Чуа.

Калі крызіс 2008 года пачаўся з іпатэчнай закрэдытаванасці фізічных асоб, то зараз пазычальнікамі выступаюць маштабныя бізнес-структуры. Апошнія дзесяць гадоў яны карысталіся мяккай грашовай палітыкай і актыўна нарошчвалі карпаратыўныя даўгі. Калі-небудзь гэтыя даўгі прыйдзецца аддаваць. Дзесяць гадоў таму сусветныя цэнтрабанкі пачалі змагацца з крызісам зніжэннем ключавых ставак. Ужыць той жа самы метад у 2018 годзе будзе нашмат складаней, папярэджвае галоўны эканаміст Swiss Re Institute Жан Хегелі. Справа ў тым, што цэнтрабанкі да гэтага часу не аднавілі ключавыя стаўкі да тых значэнняў, што былі да крызісу 2008-га. З-за гэтага апусціць стаўкі гэтак жа моцна, як дзесяць гадоў таму, проста не атрымаецца. Доля рынкаў, якія развіваюцца, у глабальным ВУП па парытэце пакупной здольнасці цяпер складае 60 працэнтаў, а напярэдадні крызісу было 45. Гэта сведчыць аб тым, што развітыя краіны так і не аднавіліся пасля ўдару 2008 года.



Нафта — яшчэ адзін фактар рызыкі. Чылі, Турцыя, Тайвань, Егіпет і нават Індыя з Кітаем моцна залежаць ад імпарту энерганосьбітаў. Калі «чорнае золата» падаражэе, выдаткі на яго закупку ў гэтых краінах моцна вырастуць. Некаторыя аналітыкі і ўвогуле чакаюць павышэння расцэнак да 100 долараў за барэль. Такі сцэнарый паскорыць наступленне фінансавага крызісу на рынках, якія развіваюцца.

### Еўраскептыкі і «бурбалка»

У Італіі да ўлады прыйшлі папулісты і еўраскептыкі — і амаль адразу загаварылі аб магчымай адмове ад еўра і вяртанні да ліры. Прэса нават прыдумала новае слова для патэнцыйнага выхаду Італіі з ЕС — Quitaly. Тут англійскае слова quit (у перакладзе «выходзіць» або «адмаўляцца») аб'яднаны з Italy, гэта значыць з Італіяй. Па такой жа формуле прыдумана слова брэксіт. Дзяржаўны доўг Італіі перавышае 2 трлн еўра — гэта больш, чым у любой іншай краіны ў Еўрасаюзе. У адносінах да ВУП доўг складае 130 працэнтаў — яшчэ адзін антырэкорд італьянскай эканомікі. Незалежна ад таго, выйдзе Італія з ЕС або не, цесныя эканамічныя сувязі італьянскага бізнесу з астатняй Еўропай могуць пацягнуць на дно ўсе краіны Еўрасаюза.

Вялікабрытанія — яшчэ адна небяспечная кропка. Краіна быццам бы вырашыла пакінуць ЕС у сакавіку 2019 года, але так і не дамовілася з Еўрасаюзам аб умовах выхаду. Да гэтага часу не выключаны варыянт «жорсткага» выхаду, пры якім брытанскія кампаніі пазбавяцца ўсіх ільгот у Еўропе. Гэта негатыўна адаб'ецца на брытанскіх банках і эканоміцы ў цэлым, што пацягне за сабой «заражэнне» спалучаных эканомік Старога Свету.

Агенцтва Bloomberg знайшло краіны, якія выжылі ў крызіс 2008—2009 гадоў. Такімі дзяржавамі аказаліся Аўстралія, Канада, Швецыя і Нарвегія. З надыходам мінулага крызісу ў гэтых краінах не спыніўся рост эканомікі. Напрыклад, ВУП Аўстраліі безупынна расце цягам 27 гадоў. Аднак бум у эканоміцы надзьмуў «бурбалку» на мясцовых рынках нерухомасці. Дамы і кватэры ў буйных гарадах Аўстраліі і Канады б'юць рэкорды практычна штомесяц — толькі ў Сіднеі за 27 гадоў кошт квадратнага метра павялічыўся ў пяць разоў. Значная частка нерухомасці купляецца ў іпатэку, і, як вынік, разам з цэнамі расце закрэдытаванасць насельніцтва. Калі «бурбалка» лопне, самыя паспяховыя эканомікі на планеце могуць стаць новай крыніцай праблем.

МВФ прагназуе, што сусветнай эканоміцы для прадухілення «вялікай дэпрэсіі» прыйдзецца пераадолець многія выклікі. Экс-прэм'ер Вялікабрытаніі Гордан Браўн адзначыў, што глабальная эканоміка, як лунацік, рухаецца наўпрост у фінансавы крызіс. Небяспека новай «вялікай дэпрэсіі», на думку Браўна, у тым, што цяпер з ёй проста няма каму спраўляцца.

**Захар БУРАК.**

# МОДА ЯК ВЕЧНАЯ ГАРМОНІЯ

## Таццяна Сямёнава — пра рэдкую прафесію траблшутар стылю

**«Каб адкрыць бізнес, я прадала кватэру», — упершыню для СМІ прызнаецца Таццяна Сямёнава, больш вядомая для тысяч сваіх падпісчыкаў як TanyaGoldMay. Блог яе жыцця кранае чытача да глыбіні душы, разбівае сэрца і выклікае лёгкія дрыжыкі. Яна прайшла праз агонь, ваду, а засталася ўсё такая ж. Бадзёрая, прыгожая, добрая да людзей.**

**Сёння Таццяна займае рэдкую нішу — траблшутар стылю. Спецыяльна для «Звязды» яна расказала пра ценявы бок моды, пра тое, што можна замарозіць красу і адчуваць сябе ў 50 прыгажэйшай, чым у 20. Чаму і маршчыны, і лішні кілаграм — гэта індывідуальнасць, якая ў цане? Ці ёсць любоў да новай жонкі былога мужа, іх дзяцей? Мужчыны могуць пайсці заварыць гарбаты, бо гутарка пойдзе пра тое, як маці адной выхаваць з сына сапраўднага байца па жыцці. Цікава?**

### Шэрая моль — стан душы, не гардэроба

Яна адмовілася ад вучобы ў Шчукінскім вучылішчы тады, калі конкурс на месца складаў больш за сотню чалавек. Дачка славутага савецкага архітэктара, Таццяна Сямёнава расла ў казачнай атмасферы: дзверы дома былі адчынены для таленавітых мастакоў, музыкантаў, а сэрца — для тэатра і мастацтва. Яна пайшла па слядах бацькі, стаўшы архітэктарам. А далей шэраг адукацый: мастацтвазнавец, эканаміст, псіхолаг. Сёння Таццяна вяжа ўнікальнае адзенне, ладзіць выстаўкі.

«Траблшутар стылю. Гучыць страшнавата. Што гэта такое і з чым яго есці?» — пытаю.

«Усё ў жанчыне залежыць ад душы. Як яна адчувае сябе? Унутрана зацiснутая праблемамі, жанчына не можа да канца зразумець, якая яна. А вы заўважалі, як у кіно паказваюць пакаёвак, абслуговы персанал? У іх уніформа колеру «моль». Незаўважная, — адказвае гераіня. — Накрытыя сваімі праблемамі, мы становімся падобныя на гэтую шэрую моль — нас не відаць. У такім стане не сустрэнеш каханне, не пабудуеш поспех. А калі выраўшаеш унутранае, здымаеш блокі, няўпэўненасць — становішся яркай. І робіш тое, што, можа, хацела рабіць заўжды, але былі бар'еры. Гэта і ёсць траблшутар стылю. Дапамога не толькі ў афармленні сябе знешне, а афармленні як асобы. Пошук стылю як індывідуальнай сілы, стрыжня, якія кожная з нас выпакутавала».

Мода Таццяну цікавіць не як тое, што сёння носім кеды з шубай, заўтра — звярыныя і зміяныя прынты, і заўсёды — паліто колеру «вярблюд». Не, мода як вечнае, гармонія, змяшэнне фарбы і фактуры, як легендарная Марына Абрамовіч з уменнем камбінаваць фантастычныя ўпрыгажэнні, як сакрэт маладосці ў старасці ад мадэльера Віўен Вествуд.

### Мода на маршчынку, лішні кілаграм

«Сёлета Канстанцін Панамароў робіць паказ калекцыі шуб. Ён запрасіў у мадэлі — увага! — не юных дзяўчат, а жанчын майго ўзросту, мяне ў тым ліку, — кажа Таццяна. — Я атрымаю захапляльную пробу пяра — упершыню выйду на дэфіле. Цяпер свет рухаецца да чаго? Мадэль не павінна быць маладой, прыгожай. Не, толькі індывідуальнай! Гэта канцэпцыя адзення для нас з вамі, не заводлівае штосьці, а паўсядзённае, даступнае».

Так званы бодзі-пазітыў, калі любіш кожную маршчынку і лішні кілаграм, даўно выйшаў на першае месца ў ЗША і Заходняй Еўропе. Легендарны брэнд бялізны Victoria's Secret перажывае не лепшыя часы: іх рэдкай красы мадэлі з дасканалымі фігурамі не падобныя да рэальных жанчын, якія і павінны купляць гэтую прадукцыю. Адышлі ў нябыт і страшныя часы, калі модныя часопісы дэманстравалі анамальна худых дзяўчат. Сёння трэнд на апетытных, спартыўных, а галоўнае, здаровых. Амерыканская мадэль Іскра Лоўрэнс, набраўшы вагу, атрымала мільённую аўдыторыю фанатаў. Бо яна цяпер не стандарт, не штампоўка гламурнай прэсы. І ў Беларусь гэта прыходзіць.

«Цяпер у модзе натуральная краса. Вы думаеце, гламур памёр ці проста затаіўся?» — цікаўлюся.

«Чалавек будзе шкадаваць толькі пра тое, што мала любіў, мала падарожнічаў і мала чытаў. Бо гэтыя заняткі — работа душы. Яны застаюцца з намі, а наноснае сыходзіць. Але цалкам гламур, мішура не адамруць. Гэта абумоўлена культурным асяродкам. На жаль ці на шчасце, ёсць градацыя, натуральны адбор. Індывідуальнасць заўжды ў цане. Яе могуць ненавідзець, асуджаць, любіць. А гламур застанецца для чырвонай дарожкі. Без гэтага таксама нельга. Проста ён не павінен запаўняць усё жыццё. Напрыклад калі ў цябе ёсць сабалiная шуба, дрэнны тон ісці ў ёй выкідваць смецце. Вопратка павінна быць дарэчы. І важны мінімалізм. Японцы кажуць: «Мэбля, запаўняючы жыллё, перашкаджае». Мы прыходзім да таго, што пазбаўляемся ад лішняга, якое цягне назад. Усюды павінен быць дастатковы мінімум, які можна перадаць людзям. Бо чалавек смяротны і, як правіла, смяротны раптоўна. А што пакінеш пасля сябе, акрамя пылу? Лепш пакінуць добрую памяць. Учынкі, творчасць, дабрадзейнасць неўмiручыя», — упэўнена Таццяна.

«Ці можна выглядаць каралевай у таннай сукенцы з рынку?» — цікаўлюся.

«Я хачу вам сказаць, калі я вучылася ў школе, у нас была форма! Аднолькавая як моль *(смяёмся)*, і тым не менш мы ўмудраліся праяўляць сваё «я»: каўнерык, фальбонка, прышпіленая кветачка. Любую самую простую рэч можна абыграць. Мільён спосабаў завязаць хусцінку, вузел. Я маўчу пра завушніцы, бранзалеты, — дзеліцца Таццяна. — Стыль любіць розум і фантазію».

«Сёння актуальныя шоўрумы. У Мінску іх колькасць расце ў геаметрычнай прагрэсіі. У вас рэдкі погляд на стыль і моду. Вы вяжаце на замову калекцыйныя рэчы, адпраўляючы іх па ўсім свеце. Вы плануеце адкрыць нешта падобнае?» — пытаю.

«У мяне было жаданне рабіць строі для оперы. Тэатральныя, — чую ў адказ. — Гэта мая старая мара. Не шоўрум, не мас-маркет. Адзенне, я сказала бы, у стылі дзягілеўскіх сезонаў. Прыгожа, незвычайна, шыкоўна. Гэта не гламур, а мастацтва. Вось такія рэчы я рабіла б з асалодай».

### Падлога з кветак і фінансавая здрада

Праз блог Таццяна Сямёнава раскрывае голую праўду свайго лёсу, не тоячы ні смешнае, ні балючае. Яна дзеліцца гісторыяй кахання,



калі кветкі ўсцілалі ўсю падлогу, успамінае і трагічны яе канец. Моцныя ўдары, узлёты, падзенні. Сёння Таццяна апісвае тэхнікі супакойвання, вынесеныя з ёгі, сакрэты медытацыі, даравання, прыняцця, важныя ў рабоце траблшутара стылю. Яна заўжды адказвае на пытанні, хоча дапамагчы, бо сама не раз была ў стане адчаю:

«Дачцэ паўгода, мы засталіся з ёй адны, сын паехаў. А я дамаўляюся з адной блізкай мне сям'ёй пра сумесны бізнес. Прадаю кватэру, здымаю маленькую двухпакаёўку, усе грошы да капейкі — у справу. Гэту сям'ю я ведала шмат гадоў і асабліва любіла маці свайго знаёмага. Яна была надзвычайная жанчына, і ад яе я многае даведалася пра жыццё. За некалькі месяцаў грошы павялічыліся ў разы. І аднойчы цудоўнай раніцай тэлефаную абмеркаваць рабочыя пытанні, а ні адзін тэлефон не адказвае. Людзі зніклі, растварыліся разам з усім зарobленым. Смешна, сумна, дзіўна, страшна».

Таццянін бізнес быў звязаны з будаўніцтвам з прычыны яе архітэктурнай адукацыі. «Божа, добра што ўзяў грашыма», — успамінае яна яўрэйскую мудрасць. Калі губляеш, аказваецца пасля, што гэта была плата за будучыню. Лёс праверыў Таццяну на ўстойлівасць: колькі яна можа вытрымаць, не згубіўшы дзіцячую радасць жыцця і агонь у вачах? І гераіня ўспамінае Таццяну Акунеўскую, актрысу часоў Сталіна, якая адбыла несправядлівы тэрмін у турме, выйшла, да смерці іграла на падмостках, захавала і розум, і красу, і бадзёрасць. Таццяну выхоўвалі на прыкладах такіх жанчын.



> **Адышлі ў нябыт і страшныя часы, калі модныя часопісы дэманстравалі анамальна худых дзяўчат. Сёння трэнд на апетытных, спартыўных, а галоўнае, здаровых.**

«Мой бацька — я так магу сказаць! — быў вялікі чалавек. Столькі людзей дагэтуль мне піша, тэлефануе. Бо калі ён бачыў талент, то заўжды дапамагаў і даваў старт. На схіле яго дзён я не адыходзіла ад ложка, ловячы дыханне, апошнія словы. «У кожным чалавеку ёсць і душа, і камяні. Развівайце душу, будзьце велікадушныя», — даваў ён апошні наказ. Мне б хацелася тым, што я пішу, можа, камусьці дапамагчы разумець важнае, натхніць. Не прэтэндую на тое, што я разумнейшая за ўсіх», — сумна ўсміхаецца гераіня.

«Таццяна, больш за ўсё чытачоў здзіўляе ваша блізкае сяброўства з новай жонкай былога мужа, іх дзецьмі. Гэта як называецца?» — пытаю.

«Гэта закон нашай сям'і — усіх прымаць. Мая мама была маленькая, калі адчыніліся дзверы, увайшоў нейкі хлопец і сказаў, што ён яе брат, — смяецца Таццяна. — Амаль як у фільме: «Добры дзень, я ваша цётка». Аказваецца, у майго дзеда да вайны была іншая сям'я. Бабуля пра гэта не ведала. Калі тая яго жонка памерла, дзед прывёў у хату свайго сына. І бабуля абняла яго, і выхоўвала, і любіла. Дзеці — вялікая радасць».

«З пялёнак гаварыла сыну: «Ты можаш усё». Ніколі ні за што не сварылася. Крычаць на дзіця — злачынства. Памятаю, мы гулялі, ён замучыўся. Яму было ўжо шэсць гадоў, і я несла яго на руках, ён заснуў. Іду, цяжка, думаю: «Родны мой, адпачывай. Мама можа несці цябе колькі заўгодна». Нельга пералюбіць дзіця, — упэўнена Таццяна. — Будавалі нейкія хаткі проста ў кватэры, спалі ў іх, гулялі, выдумвалі гісторыі пра іншыя сусветы. Я марыла, каб ён вырас чалавекам без межаў. І сёння магу сказаць, што нашы думкі ствараюць будучыню нашых дзяцей. Трэба памятаць, што, як у казцы Добраму малайцу прызначаны выпрабаванні, так і ў жыцці хлопчыку трэба нырнуць у цяжкасці з галавой. Я адпусціла сына ў далёкую краіну зусім юным. Невыносна балюча было жыць у разлуцы доўгія гады. Але мацярынскі эгаізм — трымаць хлопчыка каля сваёй спадніцы».

Таццяна Сямёнава змалку верыла, што самае яркае жыццё пачнецца ў яе цяперашнім узросце: «З дзяцінства ў мяне няма страху сталасці. Абсалютна. Ніколі! Наадварот, я ведала, што гэта будзе перыяд росквіту. Памятаю, мы адпачывалі ў Юрмале з бацькамі і мамінай сяброўкай, якая паказала мне ёгаўскія практыкаванні, іх я раблю дагэтуль. І ў той момант у мяне здарылася азарэнне. Мне 15, ёй — 45. Я думаю: «Божа мой! Яна ж дзяўчынка!» Вось! Узросту не існуе! Белы прыбалтыйскі пясок, шэзлонг, ногі ў вадзе. Заход сонца. І я, юная, прыдумваю, што ў 50 вярнуся сюды пісаць маю кнігу».

**Маргарыта САДОЎСКАЯ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 20 %) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА СВИСЛОЧСКОГО ФИЛИАЛА ГРОДНЕНСКОГО ОБЛПОТРЕБОБЩЕСТВА**

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **ЛОТ № 1** | | |
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение инв. № 413/С-20676** (безалкогольный цех) общей площадью 1064,9 кв. м, кирпичное, 1969 г. п. **Капитальное строение инв. № 413/С-19954** (кондитерский цех) общей площадью 564,9 кв. м, кирпичное, 1975 г. п., составные части и принадлежности: подвал, пристройка. **Капитальное строение инв. № 413/С-19952** (весовая) общей площадью 80,0 кв. м, кирпичное. **Капитальное строение инв. № 413/С-20677** (здание отбора проб воды) общей площадью 4,9 кв. м, кирпичное, 1969 г. п. **Капитальное строение инв. № 413/С-21120** (трансформаторная подстанция), высота – 0,9 м, 1977 г. п. | **Капитальное строение инв. № 413/С-20675** (цех минеральной воды) с двумя пристройками и террасой общей площадью 1547,2 кв. м, кирпичное, 1975 г. п., составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие 1529 кв. м; покрытие из бетонной плитки 157 кв. м; бордюр тротуарный 24,7 м; бордюр дорожный 45,3 м; ограждение (4 шт.); ворота (2 шт.); калитка; площадка ТБО | **Капитальное строение инв. № 413/С-20678** (артезианская скважина минеральной воды), составные части и принадлежности: павильон, артезианская скважина минеральной воды, дорожка |
| Информация о земельном участке, ограничения прав | Площадь 1,7298 га, кадастровый номер 425250100001000418, назначение – содержание и обслуживание зданий и сооружений. Водоохранная зона водных объектов (1,7298 га) | Площадь 0,4150 га, кадастровый номер 425250100001002178, назначение – обслуживание здания цеха минеральной воды. Водоохранная зона водных объектов (0,4150 га); охранная зона сетей и сооружений газоснабжения (0,0136 га) | Площадь 0,0494 га, кадастровый номер 425250100001000419, назначение – содержание и обслуживание артскважины. Охранная зона малых рек и охранная зона подземного источника водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения (0,0494 га) |

Местонахождение имущества: **Гродненская обл., Свислочский р-н, г. Свислочь, ул. Волковысское шоссе, д. 1, 1А, 1Б**

| Начальная цена | **459 690 руб. 40 коп. с учетом НДС** | Сумма задатка (5 %) | **22 985 руб. 00 коп.** |
|---|---|---|---|

**Сведения о продавце:** Свислочский филиал Гродненского облпотребобщества, г. Свислочь, ул. Комсомольская, 6, тел. 8 (01513) 32495

**Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка:** Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906

**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов. **Условия оплаты:** по договоренности сторон

**Торги состоятся 16 ноября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

| Срок подачи документов для участия в торгах | **По 12 ноября 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** |
|---|---|

**Условия участия и порядок проведения аукциона www.fincentr.by, тел.: 8 (0152) 744911, 772379. Предыдущая публикация: газета «Звязда» от 20.09.2018 г.**

# ТАЯМНІЦЫ ГАРАДЗЕНСКАГА ПАСЕЛІШЧА



Фота Мікалая ЛАПІНА.

## Рэканструкцыя раскрывае новы воблік Старога замка, але спрэчкі вакол яе не заціхаюць

**Галоўны канфлікт — як захаваць аўтэнтычнасць? Гэтым занепакоены не толькі самі беларусы, але і суседзі-палякі, якія лічаць замак часткай сваёй спадчыны. Польскія СМІ неаднойчы бралі пад сумненне ход рэканструкцыі гістарычнага аб'екта. Каб зняць гэтыя пытанні, беларускі бок запрасіў польскіх спецыялістаў пазнаёміцца з тым, што робіцца на месцы. Пасля сустрэчы яны вынеслі свой вердыкт — рэканструкцыя гарантуе захаванне аўтэнтычнай часткі Старога замка.**

### Як змяняецца выгляд

Больш за год таму пачалася рэканструкцыя галоўнага замка Гродна. І зараз відаць, якія змены адбыліся за гэты час. Шэры будынак паступова набывае рысы сапраўднага палаца. Галоўным элементам можна лічыць вежу над уваходнай аркай, якая будзе ўвянчана купалам. Асноўны фасад ярэ гатовы, зараз работы вядуцца на даху. Пабудаваны другі паверх галерэі. Ідуць работы па ўзнаўленні сярэдняй вежы і крапасной сцяны, якая будзе акружаць замак. Паколькі гэтая агароджа цягнецца па самым краі схілу, яго таксама ўмацоўвалі. Летам каля сцяны раскапалі фундамент мернай ізбы, на якім гэты гаспадарчы аб'ект пабудуюць наноў. Наогул раскопкі на старажытным замчышчы вядуцца вельмі грунтоўныя, тут ужо зроблена шмат знаходак і выцягнута з глыбінь стагоддзяў.

Налета ў планах завяршыць рэканструкцыю першай чаргі. Паралельна вядзецца праектаванне інтэр'ераў уваходнай групы.

### Як захоўваецца старажытнасць

Менавіта з таго месца, дзе цяпер вядуцца работы па рэканструкцыі замка, і пачаўся горад. Старажытны аб'ект спалучае розныя эпохі — ад XII да XVIII стагоддзяў. Сляды тых часоў выяўляюцца як пры зняцці паверхневых пластоў будынкаў, так і пры раскопках. За год раскапалі больш за дзясятак драўляных пабудоў XIV стагоддзя. У адным з памяшканняў знойдзены рэшткі печы і фрагменты прадметаў побыту. Гэты кавалак старажытнасці ў далейшым будзе законсерваваны і стане часткай экспазіцыі.

Зараз нямала таго, што паднялі з глыбінь гісторыі, экспануецца ў фае замка. Тут можна ўбачыць жаночыя пярсцёнкі са сплаву свінца і бронзы, кераміку. Адна з першых знаходак — старажытная шахматная ладдзя. Дарэчы, падобная фігура была знойдзена ў 30-х гадах мінулага стагоддзя падчас раскопак заснавальнікам музея Юзафам Ядкоўскім. Сярод апошніх цікавых артэфактаў — цэгла з гербам «Стаўбы Гедыміна», які сустракаецца на манетах XIV стагоддзя.

Аднаўленчыя работы захаваюць элементы ўсіх гістарычных эпох, паведаміў **галоўны архітэктар праекта Алег ШЫМБАРЭЦКІ.** Напрыклад, у скляпістай столі галерэі кладзецца «родная» цэгла. З боку крапаснай сцяны знойдзены масіў часоў Вітаўта. Каб яго захаваць, адмовіліся ад ідэі скразнога прахода. Сюды будзе весці асобная лесвіца з першага паверха.

Пасля таго як выраўняюць былыя дымаходы, на столь будзе вернута старажытная тынкоўка.

### У мэтах бяспекі

Разам з гэтым асобныя канструкцыі патрабуюць абнаўлення ў мэтах бяспекі, бо прыйшлі ў непрыдатнасць і знаходзяцца ў аварыйным стане. Асабліва гэта датычыцца праёмаў і перамычак. Усе яны ў расколінах, дэфармаваныя, таму будуць замацоўвацца. Некаторыя канструкцыі ўвогуле стаялі без фундамента проста на пяску і будаўнічым смецці і маглі спаўзці ўніз па схіле. Польскім экспертам прадэманстравалі відэаматэрыял, на якім відаць, як рабочы без усялякіх прылад здымае старую кладку, а яна літаральна сыплецца са сцяны. Такія канструкцыі трэба замяніць. Узнікаюць цяжкасці і з пракладкай камунікацый. Зразумела, што замак будаваўся без уліку інжынерных сетак, і зараз іх трэба «ўціскваць» у старажытны аб'ект.

Дарэчы, усе работы вядуцца пад наглядам Міністэрства культуры, узгадняюцца нават невялікія праўкі. Самадзейнасці тут ніхто не дапускае. Па словах **начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Беларусі Аксаны СМАТРЭНКІ,** рэканструкцыя вядзецца згодна з нормамі нацыянальнага заканадаўства, а таксама з улікам вопыту аднаўлення аналагічных аб'ектаў у Польшчы і Літве. Пры неабходнасці знаходзяцца кампрамісныя рашэнні.

### Эпоха Стафана Баторыя

Палякі невыпадкова цікавяцца рэканструкцыяй замка. Аб'ект абнаўляецца «пад эпоху» караля польскага і вялікага князя літоўскага Стафана Баторыя, які ў XVI стагоддзі ўзнавіў замак і надаў яму шыкоўнае аблічча. Палацы таго перыяду захаваліся ў Варшаве і ў Кракаве. **Загадчык аддзела Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы Міхал МІХАЛЬСКІ** зазначыў, што Стафан Баторый — гэта асоба, якая займае важнае месца і ў беларускай, і ў польскай гісторыі. Гэтым выклікана і жаданне бліжэй пазнаёміцца з рэканструкцыяй, аб якой нямала пішуць польскія СМІ. Чыноўнік паведаміў, што ў польскага боку назапашаны значны вопыт работы па аднаўленні падобнага палаца і ён гатовы аказаць кансультацыйную дапамогу гродзенцам.

Спецыялісты з двух краін пагаджаюцца, што перабудовы будуць даволі значныя. Замак захаваўся з планіроўкай, якую ён атрымаў у канцы XIX стагоддзя, калі тут размяшчаліся часці расійскай арміі. Па сутнасці, ён выглядаў як звычайная шэрая казарма. Зараз, падчас рэканструкцыі, планіроўка значна змяняецца, бо гэта будзе зусім іншы палац. А тое, што раскрываецца са старажытных часоў, па магчымасці будзе захавана. Разам з тым з'явяцца новыя аб'екты, якія былі тут некалі, але не дайшлі да сённяшняга дня. Адкуль даведаліся аб іх ранейшым існаванні?

Замак узнаўляецца згодна з гравюрай Макоўскага «Гродна. 1600 год». Гэта адзіны гістарычны дакумент эпохі Стафана Баторыя, які дае ўяўленне аб выглядзе палаца.

— Зразумела, што да гэтага аб'екта пільная ўвага, і наша задача, каб ён праісnаваў яшчэ доўга. Для гэтага робім усе магчымае, — адзначыў **дырэктар інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Вячаслаў ТАРАСЕВІЧ.** — Мне здаецца, што людзі, якія не так глыбока ведаюць гісторыю, неспецыялісты, будуць проста любавацца гэтым аб'ектам і бачыць не былыя шэры будынкі ці рэшткі сцен, а палац, які будзе вабіць турыстаў.

### Інтэр'еры і купал

Распрацоўка інтэр'ера — другі этап рэканструкцыі, і самы складаны. У многім гэта абумоўлена недахопам спецыялістаў. Таму ёсць намер прыцягнуць да работы з інтэр'ерам польскі бок. Асабліва што датычыцца работы з каменным дэкорам. Самі палякі гатовы весці перагаворы па аб'ёмах работы і прызначэнні пэўных спецыялістаў для дапамогі ў распрацоўцы інтэр'ера.

Падчас сустрэчы ўзнікла пытанне па форме купала, які ўвянчае ўваходную вежу. Ён увасоблены ў сучасным праекце згодна з гравюрай Макоўскага, бо іншых аналагаў у гісторыі, як вядома, не захавалася. Падчас распрацоўкі праекта разглядаліся і іншыя варыянты. У рэшце рэшт спыніліся на першапачатковым. Спецыяліст з Польшчы выказала сваё бачанне формы купала. На яе думку, ён занадта масіўны. Магчыма, гэта пытанне будзе абмяркоўвацца больш дэталёва падчас другой сустрэчы кансультацыйнай камісіі, якая павінна адбыцца на пачатку наступнага года ў Польшчы. Беларускі бок гатовы разглядзець прапановы польскіх спецыялістаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Алена КЛІМОВІЧ, начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама:**

— Падчас сустрэчы беларуска-польскай рабочай групы палякі згадзіліся, і мы гэта сумесна замацавалі ў пратаколе, што пры правядзенні работ захоўваюцца аўтэнтычныя часткі Старога замка. Такім чынам, прадстаўнікі міністэрства культуры Польшчы згаджаюцца, што работы вядуцца на прафесійным узроўні. Гэта здымае многія пытанні.

З польскім бокам існуе дагавор аб культурным супрацоўніцтве ў рамках міжведамаснай камісіі. Мы ім паказалі аб'ект, яго стан, у тым ліку і аварыйныя ўчасткі. Так, пры аднаўленчых работах выкарыстоўваецца сучасная цэгла. Але і ў мінулыя эпохі будавалі замак з тагачасных матэрыялаў. Чаму мы павінны рабіць падаражанне пад абшыўкай? Гэта дапушчальна там, дзе вядзецца кладка па ўзоры сцяны, як, напрыклад, у Крэўскім замку. На рэканструкцыі Старога замка мы, дзе магчыма, захоўваем аўтэнтыку, а дзе дапушчальна — выкарыстоўваем новыя тэхналогіі і будаўнічыя матэрыялы. Польскія спецыялісты, у тым ліку чатыры прафесары, прадстаўнікі міністэрства культуры, пагадзіліся, што праект навукова абгрунтаваны, і гатовы нам дапамагаць. А кансультацыі такога роду вельмі патрэбныя.


## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гродномпромтехника», расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Понемуньская, 20, 20 ноября 2018 года

| Вид аукциона | Открытый |
|---|---|
| Предмет аукциона | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 16 капитальных строений (административное здание с ограждением, асфальтобетонным, бетонным, плиточным покрытиями, диспетчерская-проходная, бытовка для охраны, склад запчастей-мастерская, арочный гараж, арочный склад, склад, производственный корпус, административное здание, склад полигона ЖБИ, котельная с пристройками, гаражи, арочный гараж, мойка автомобилей с пристройками, склад-костел, отстойники, уборная), зеленые насаждения, ограждения |
| Начальная цена продажи | **2 451 053,67 рубля** (с учетом НДС 20 %) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 422000000009003371 площадью 4,1540 га |
| Месторасположение земельных участков | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Понемуньская, д. 20** |
| Продавец | **Открытое акционерное общество «Гроднопромтехника», г. Гродно, ул. Понемуньская, 20, тел.: 8 (0152) 757367, 757368** |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования |
| Сумма задатка | **245 105,37 рубля** |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546. |
| Дата проведения аукциона | **20 ноября 2018 года** |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 |
| Дата и время начала приема документов | 5 ноября 2018 года 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 14 ноября 2018 года 17.00 |

В договоре купли-продажи будет предусмотрено:

– подписание покупателем охранного обязательства на материальную недвижимую историко-культурную ценность в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности на объект историко-культурной ценности.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении первых повторных торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Кофеин» (УНП 690646615, Минская обл., Минский р-н, Острошицко-Городокский с/с, д. Острошицкий Городок, ул. Ленинская, д. 46), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов*: 19 ноября 2018 года**. Начало – 15.00, окончание – 17.00. Заявки принимаются с 3 ноября 2018 года по 18 ноября 2018 года.

***Место проведения торгов:*** Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Кофеин» (УНП 690646615)** в лице управляющего Частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт».

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, руб. | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (здание нежилое), инв. № 611/С-10530, площадь 1670,20 кв. м | 115 200 руб. (без учета НДС) | 5 % | 5 % |
| | Земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения, инв. № 620450100001002789, площадь 0,3289 га | 21 600 руб. (без учета НДС) | | |
| Местонахождение: | | Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Зеленая, 22 | | |

Для участия в торгах необходимо:

в срок до **18 ноября 2018 года** (за день до окончания приема заявлений) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY56MTBK30120001093300086460, в ЗАО «МТБанк», код MTBKBY22, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация»;

подать организатору торгов в срок с даты опубликования по 18.11.2018 (за день до торгов) заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»;

в день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

– заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;

– на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «КВЕСТ «АЛЬФА-ГАЛАКТИКА»

Настоящие Правила проведения рекламной игры **«Квест «Альфа-Галактика»** (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Квест «Альфа-Галактика» (далее – Рекламная игра).

Рекламная игра имеет целью стимулирование использования банковских платежных карточек, эмитированных ЗАО «Альфа-Банк» (далее – Альфа-Банк), для осуществления безналичных платежей, реализации розничных банковских услуг Альфа-Банка, включая привлечение денежных средств во вклады (депозиты), использования мобильного приложения «InSync».

**1. Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Агентство Маркетинговых Коммуникаций «РЭПКА», юридическое лицо согласно законодательству Республики Беларусь с местонахождением по адресу: г. Минск, 220073, ул. Ольшевского, д. 20/11, оф. 21, УНП 191728827, зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом Республики Беларусь решением от 23 августа 2012 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей.

**2. Заинтересованные лица Рекламной игры.**

Заинтересованными лицами Рекламной игры являются:

1. ЗАО «Альфа-Банк», 220013, г. Минск, ул. Сурганова, д. 43-47;
2. ООО «РЕФОРТЕ», 220030, г. Минск, пл. Свободы, 4-334;
3. ООО «Шуст Плюс», 220089, г. Минск, ул. Железнодорожная, 138, пом. 2;
4. ОАО «Белювелирторг», 220088, г. Минск, ул. Смоленская, 33;
5. ЗАО «Интернет-магазин Евроопт», 220019, Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Западный промузел, ТЭЦ-4, каб. 229;
6. ООО «ГиперМолл», 220019, Минская обл., Минский район, Щомыслицкий с/с, Западный промузел, ТЭЦ-4, каб. 177;
7. ООО «БАЙКАРД», 220092, г. Минск, пр-т Пушкина, д. 39, пом. 4, каб. 2;
8. ООО «КОМПАНИЯ ТЕЗ ТУР», 220100, г. Минск, ул. Кульман, 9, комн. 30.

**3. Участники Рекламной игры.**

**Участниками Рекламной игры могут быть граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане с видом на жительство в Республике Беларусь, открывшие в Альфа-Банке текущий (расчетный) счет, к которому выпущена банковская платежная карточка (далее – Карта).**

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники и лица, находящиеся с ними в отношениях свойства, а также члены Комиссии. Кроме этого, Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Альфа-Банком.

Организатор и Заинтересованное лицо не несут ответственности за несвоевременное или некорректное представление информации о транзакциях и параметров платежей другими участниками системы безналичных расчетов.

**4. Наименование Рекламной игры:** «Квест «Альфа-Галактика».

**5. Территория проведения Рекламной игры:** Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**6. Срок начала Рекламной игры:** 8 ноября 2018 г.

**7. Срок окончания Рекламной игры:** 28 февраля 2019 г.

**8. Призовой фонд Рекламной игры.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Заинтересованных лиц в размере 77 363,20 (Семьдесят семь тысяч триста шестьдесят три белорусских рубля 20 копеек);

Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы (далее – Призы):

**Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры:**

| Приз | Кем сформирован призовой фонд | Кол-во, шт. | Номинал за ед., бел. руб. | Всего стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Денежный приз 10 000 рублей** | ЗАО «Альфа-Банк» | 1 | 10 000, 00 | 10 000, 00 |
| денежные средства в размере | | | 1476,02 | 1476,02 |
| (далее – Приз 1) | | | | |
| **Денежный приз 100 рублей** | ЗАО «Альфа-Банк» | 100 | 100,00 | 10 000,00 |
| (далее – Приз 2) | | | | |
| **Автомобиль HYUNDAI CRETA (GSr) Красный перламутр VIN Z94G2811BKR129961, РФ** | ООО «РЕФОРТЕ» | 1 | 36 400,00 | 36 400,00 |
| денежные средства в размере | | | 5420,85 | 5420,85 |
| (далее – Приз 3) | | | | |
| **Сертификат на безлимитный абонемент на 12 месяцев на посещение сети фитнес-клубов «Адреналин».** Срок действия: с 28.02.2019 по 31.05.2019 | ООО «Шуст Плюс» | 1 | 1560,00 | 1560,00 |
| денежные средства в размере | ЗАО «Альфа-Банк» | | 214,87 | 214,87 |
| (далее – Приз 4) | | | | |
| **Сертификат на безлимитный абонемент на 1 (один) месяц на посещение сети фитнес-клубов «Адреналин»** Срок действия: с 28.02.2019 по 31.05.2019 | ООО «Шуст Плюс» | 3 | 130,00 | 390,00 |
| денежные средства в размере | ЗАО «Альфа-Банк» | | 1,19 | 3,57 |
| (далее – Приз 5) | | | | |
| **Ноутбук ACER Extensa ES1-523-216V NX.GKYEU.020** | ЗАО «Альфа-Банк» | 1 | 645,00 | 645,00 |
| денежные средства в размере | | | 78,15 | 78,15 |
| (далее – Приз 6) | | | | |
| **Электрочайник BRAUN WK3100WH OX21010008** | ЗАО «Альфа-Банк» | 2 | 79,86 | 159,72 |
| (далее – Приз 7) | | | | |
| Погружной блендер Bosh | ЗАО «Альфа-Банк» | 1 | 96,96 | 96,96 |
| (далее – Приз 8) | | | | |
| **Мультиварка Redmond RMC-M22 черный** | ЗАО «Альфа-Банк» | 1 | 96,96 | 96,96 |
| (далее – Приз 9) | | | | |
| **Набор чайный «Ландыш-Незабудки» + футляр** | ОАО «Белювелирторг» | 4 | 100,24 | 400,96 |
| | | 1 | 97,13 | 97,13 |
| (далее – Приз 10) | | | | |
| **Набор чаш/чайн «Ангел» + лож. (4 пр.) + футляр** | ОАО «Белювелирторг» | 1 | 301,70 | 301,70 |
| денежные средства в размере | ЗАО «Альфа-Банк» | | 26,85 | 26,85 |
| (далее – Приз 11) | | | | |
| **Пылесос Xiaomi Mi Robot Vacuum** | ООО «ГиперМолл» «Интернет-магазин Евроопт» | 2 | 658,56 | 1317,12 |
| денежные средства в размере | ЗАО «Альфа-Банк» | | 80,17 | 160,34 |
| (далее – Приз 12) | | | | |
| **Подарочный сертификат на покупки в онлайн-гипермаркете www.gipermall.by на сумму 10 бел. руб.** Срок действия: 15.02.2019 – 15.05.2019 г. | ООО «ГиперМолл» | 15 | 10,00 | 150,00 |
| (далее – Приз 13) | | | | |
| **Подарочный сертификат на покупки в онлайн-гипермаркете www.e-dostavka.by на сумму 10 бел. руб.** Срок действия: 15.02.2019 – 15.05.2019 г. | «Интернет-магазин Евроопт» | 15 | 10,00 | 150,00 |
| (далее – Приз 13.1) | | | | |
| **Подарочный сертификат на покупки в онлайн-гипермаркете www.gipermall.by на сумму 15 бел. руб.** Срок действия: 15.02.2019 – 15.05.2019 г. | ООО «ГиперМолл» | 10 | 15,00 | 150,00 |
| (далее – Приз 14) | | | | |
| **Подарочный сертификат на покупки в онлайн-гипермаркете www.e-dostavka.by на сумму 15 бел. руб.** Срок действия: 15.02.2019 – 15.05.2019 г. | «Интернет-магазин Евроопт» | 10 | 15,00 | 150,00 |
| (далее – Приз 14.1) | | | | |
| **Подарочный сертификат на покупки в онлайн-гипермаркете www.gipermall.by на сумму 20 бел. руб.** Срок действия: 15.02.2019 – 15.05.2019 г. | ООО «ГиперМолл» | 5 | 20,00 | 100,00 |
| (далее – Приз 15) | | | | |
| **Подарочный сертификат на покупки в онлайн-гипермаркете www.e-dostavka.by на сумму 20 бел. руб.** Срок действия: 15.02.2019 – 15.05.2019 г. | «Интернет-магазин Евроопт» | 5 | 20,00 | 100,00 |
| (далее – Приз 15.1) | | | | |
| **Сертификат ByCard номиналом 760,00 рублей.** Срок активации: не ограничен; | ООО «БАЙКАРД» | 2 | 760,00 | 1520,00 |
| денежные средства в размере | ЗАО «Альфа-Банк» | | 95,33 | 190,66 |
| (далее – Приз 16) | | | | |
| **Сертификат ByCard номиналом 380,00 рублей;** Срок активации: не ограничен; | ООО «БАЙКАРД» | 2 | 380,00 | 760,00 |
| денежные средства в размере | ЗАО «Альфа-Банк» | | 38,55 | 77,10 |
| (далее – Приз 17) | | | | |
| **Сертификат на тур в Турецкую Республику (Анталийское побережье)** с вылетом в тур в период с 01.05.2019 года по 15.05.2019 года на 7 (семь) ночей для 2 (двоих) взрослых человек, состоящий из авиаперелета по маршруту Минск – Анталия – Минск (включая аэропортовый сбор), трансфера на территории Турецкой Республики по маршруту аэропорт – отель – аэропорт, проживания в отеле 5* с типом питания «все включено», стандартной медицинской страховки на период тура | ООО «КОМПАНИЯ ТЕЗ ТУР» | 1 | 4400,00 | 4400,00 |
| денежные средства в размере | ЗАО «Альфа-Банк» | | 639,24 | 639,24 |
| (далее – Приз 18) | | | | |
